Алімпія (Алімпа), Віргінія, Квятаслава, Магдаліна, Марыя, Петрунелія (Петрунеля), Юзэфа

**9** Аліпій (Аліп), Васілій (Васіль), Вяслаў, Георгій (Юрый), Данііл (Даніэль), Дзіега, Іаан (Іван, Ян), Іакаў (Якаў, Якуб), Іакім, Ілія (Ілья),

Інакенцій, Купрыян, Мікалай, Міхаіл, Назарый (Назар), Пётр, Стыліян, Ціхан

Аніка, Валерыя, Вяслава, Гаргонія, Дэльфіна, Іаанна (Яна), Ізабела, Леакадзія, Наталія (Наталля)

**10** Аляксей (Аляксій), Андрэй, Апалос, Багдан, Барыс, Вальдэмар, Васілій, Віталій, Гаўрыіл (Габрыель), Грыгорый, Дамасій (Дамас), Данііл, Дзідзім, Дзімітрый (Дзмітрый), Захар, Іаан (Іван, Ян), Іаасаф (Іасаф), Іакаў (Якаў, Якуб), Кранід, Ксенафонт, Маўр, Мікалай, Нікан, Паладзій, Радзіслаў, Раман, Серафім, Сергій (Сяргей), Стэфан (Сцяпан, Сцяфан), Уладзімір, Усевалад, Фама, Фёдар (Фяодар, Тодар, Тэадор), Эдмунд

Агнеса, Даніэлія, Ларэта, Марыя, Юдзіта, Юлія, Яўлалія

**11** Аляксей (Аляксій), Багдан, Вальдэмар, Васілій, Вікенцій, Грыгорый, Дамасій (Дамас), Данііл (Даніэль), Іаан (Іван, Ян), Ірынарх, Мікалай, Мірон, Пётр, Рафаіл (Рафал), Сабін (Савін), Серафім, Сергій (Сяргей), Стэфан (Сцяпан, Сцяфан), Фёдар (Тэадор)

Анісія (Анісся), Клара, Параскева (Праскоўя), Разалія, Стафанія, Эдзіта, Юдзіта, Юлія

**12** Авіў, Акакій, Аляксандр, Візялін, Дзіянісій (Дзяніс), Іаан (Іван, Ян), Ізраіль, Канстанцін, Клімент, Конрад, Крысп, Лазар, Мар'ян, Мяркурый, Няктарый (Няктар), Парамон, Пармон (Пармен), Сергій (Сяргей), Сімяон (Сымон, Сямён), Спірыдон, Усевалад, Філумен, Фініян, Эпімах

Ада, Адэлаіда, Аляксандра, Дагмара, Іаанна (Яніна), Марыя, Мар'яна, Мяркурыя, Хрысціна, Эмалія, Ярэма

**13** Андрэй, Антоній, Антыёх, Арыстон, Арэст, Аўксенцій, Генрых, Зыгмунд, Іаан (Іван), Люцыян, Мардарый, Пётр, Уладзіслаў, Фруменцій, Яўгеній, Яўстрацій

Атылія, Дарацея (Дарота), Люцыя, Раксана

**14** Альфрэд, Ананія (Ананій, Анань), Арсеній, Арэст, Вянанцій, Гаўрыіл (Габрыель), Герон, Дыяскор (Дзіяскор), Ісідар, Калінік, Навум, Пампей, Руфін, Спірыдон, Фартунат, Філарэт (Філат), Эляш, Ян

Альфрэда, Ананія, Габрыіла, Левія, Лівія, Рэгіна, Яна

**15** Абакум (Авакум), Аляксей (Аляксій), Андрэй, Антон, Афанасій (Апанас), Барыс, Валерый, Валяр'ян, Данакт, Дзімітрый (Дзмітрый), Іаан (Іван, Ян), Іракламвон (Іраклямон), Ірыней, Іясей, Канстанцін, Карл, Касма (Кузьма), Максіян, Марын, Матфей (Мацвей), Мікалай, Па-

вел, Саба, Сергій (Сяргей), Стэфан, Уладзімір, Феафіл, Фёдар (Фяодар, Тэадор), Хрысціян

Антаніна, Вера, Вікторыя, Віргінія, Іга, Крысціна (Хрысціна), Лаура, Маргарыта, Марыя, Матрона, Мірапія (Міропія, Міропа), Мірэля, Ніна, Паўла, Тамара, Фяўронія, Цыліна, Эдзіта, Яніна

**16** Агей, Адон (Адоніс), Аліцій, Альберт, Ананій, Андрэй, Баян, Георгій, Дыядот, Здзіслаў, Іаан (Іван, Ян), Мікалай, Сава, Сафонія (Сафон), Сафроній, Севасцьян, Феадул, Фёдар (Фяодар, Тэадор), Эвяранд, Эўзебій

Адэлаіда, Аліна, Аліцыя, Альбіна (Альвіна), Антаніна, Бяата, Здзіслава, Эўзебія

**17** Аляксандр, Аляксей (Аляксій), Бэда, Васілій, Генадзій, Дамаскін, Дзімітрый (Дзмітрый), Іаан (Іван, Ян), Лазар, Лука, Мадэст, Мікалай, Фларыян, Хрыстафор, Юзаф

Алімпія, Анастасія, Барбара (Варвара), Вераніка, Вівіна, Генадзія, Іаланта, Ізабела, Іўліянія (Юліянія, Юльяна, Ульяна), Кацярына, Кіра, Мадзеста, Юліянія

**18** Анастасій, Аўксенцій, Багдан, Багуслаў, Браніслаў, Віктар, Вунібальд, Генадзій, Грацыян, Гурый, Захарыя (Захарый, Захар), Ілія (Ілья), Карыён, Лаўрэнцій, Малахій, Павел, Пётр, Сава, Сергій (Сяргей), Флавіян (Фламіян)

Багуслава, Браніслава, Генадзія, Гражына, Грацыя, Лаўрэнцыя

**19** Анастасій (Анастас), Вільгельм, Гаўрыіл (Габрыель), Грыгорый, Дарый, Мікалай, Урбан, Яраслаў

Габрыіла (Гаўрыіла), Ева, Марта, Марыя, Фаўсціна (Фаўста), Элеанора, Эсфір

**20** Амбросій (Амвросій, Амброс), Андронік (Андрон), Антоній (Антон), Афінадор, Багуміл, Васілій, Галакціён, Гурый, Дамінік, Зефірын, Іаан (Іван, Ян), Ігнацій, Лібяраль, Лібярат (Ліберт), Макарый (Макар), Міхаіл, Міхей, Нікіфар (Нічыпар), Ніл, Павел, Пётр, Сергій (Сяргей), Урсыцін (Урсын), Феафіл, Філагоній (Філагон), Юлій, Яўгеній

Антаніна, Багуміла, Дагмара, Дамініка, Філафея (Філафцея)

**21** Анастас, Андрэй, Анісіфар, Апалос, Апелій, Іаан (Іван, Ян), Канізій, Кесар, Кірыл, Кіфа, Міхей, Патапій (Патап), Пётр, Сасфен, Севярын, Сергій (Сяргей), Таміслаў, Фама, Фемістаклей (Фемістокл), Ціхік, Эпафрадзіт

Анна, Анфіса, Каміла, Таміслава

**22** Аляксандр, Артур, Васілій, Зінон, Любарад, Лявон, Паўлін, Самуіл, Сафроній, Станіслаў, Сцяфан, Уладзімір, Унгер, Флавіян, Францыск (Францішак), Хірамон

Альфрэда, Анастасія, Анна (Ганна), Бальбіна, Ганарата, Грызельда, Ефрасіння, Ксаверыя, Станіслава, Францыска (Францішка), Юдзіта

**23** Актавіян, Аляксандр, Аляксей (Аляксій), Анатолій, Васілій, Віктар, Геласій, Гемел, Гілярый, Грыгорый, Дарафей (Дароцій), Ермаген, Еўнікіян (Еўнікей, Еўнікій), Зоцік, Іаан (Іван, Ян), Іаасаф (Іасаф), Іакаў (Якаў), Івон, Канстанцін, Лаўрэнцій, Мікалай, Міна, Міхаіл, Пётр, Понцій, Сатурнін, Сервулей (Сірвуль), Сергій (Сяргей), Славамір, Сцяфан (Стэфан, Сцяпан), Тарляк, Уладзіслаў (Уладыслаў), Фама, Феадул (Тэадул), Эварыст, Юзаф, Яўгеній, Яўграфій (Яўграф), Яўпор, Яўсевій (Яўсей)

Аляксандра (Алеся), Ангеліна, Анелія, Анна (Ганна), Вікторыя, Еўдакія, Малгажата, Марыя, Славаміра, Таціяна (Таццяна), Тэафіла, Уладзіслава, Фёкла

**24** Адам, Айфал, Акепсій, Віктар, Даніл (Даніэль), Зіновій, Іаан (Іван), Канрад, Лука, Мікалай, Міракс, Нікан, Павел, Урсыцін, Феафан (Тэафан), Шарбель

Адэлія, Альжбета, Ева, Зіновія, Ірміна, Моніка, Паўла (Паўліна), Эвяліна

**25** Аляксандр, Альберт, Васілій, Герард, Міхаіл, Пётр, Разумнік, Рафаіл (Рафал), Сінезій (Сінятос), Спірыдон (Свірыд), Ферапонт, Эраст

Анастасія, Анета, Анцінея, Глорыя, Марыя, Саламея, Тэрэзія (Тэрэза), Яўгенія

**26** Аксенцій, Аляксандр, Аляксей (Аляксій), Аркадзій, Арсеній, Арэст, Аўксенцій, Васілій (Васіль), Грыгорый, Дасій, Дасіфей, Дзіянісій (Дзяніс), Емяльян, Засіма (Засім), Зінон, Іаан (Іван), Іакаў (Якаў), Лука, Мардарый (Мардар), Мікалай, Нікадзім, Роберт, Сцяфан (Стэфан, Сцяпан), Уладзімір, Яўгеній, Яўстрацій (Яўстрат), Яўфімій (Яфім)

Вінцанціна (Вінцэнція), Лукія, Марына (Марыяна), Марыя

**27** Апалоній, Арыян, Баляслаў, Васіян, Іаан (Іван, Ян), Калінік, Леўкій (Ляўкій), Максім, Мікалай, Пшыбаслаў, Сымон (Сямён), Феаціх, Фёдар (Фяодар, Тодар, Тэадор), Філімон, Фірс, Цэзар

Анна, Жанета (Жанна, Яніна), Ірэна, Фабіёла, Фабіяна

**28** Аліфер (Аліхвер), Аляксандр, Антоній (Антон), Вальдэмар, Васілій, Віктарын, Дабраслаў, Еляўферый (Эляўтар, Эляўтарый), Іларыён,

Карыў, Каспер, Павел, Пард, Сцяфан (Сцяпан), Трыфан, Тэон (Фяёна, Фіён), Феафіл (Тэафіл), Цэзар, Ян

Анфія, Людміла, Феафіла, Фяёна (Фяона), Эма

**29** Агей, Аляксандр, Аркадзій, Бенядзікт, Герард (Жэрард), Давід, Даваскін, Дамінік, Ілія (Ілья), Лот, Макарый (Макар), Марцін, Марцініян, Марцэлій (Марцэль), Марын, Міхаіл, Павел, Пётр, Томас, Трафім, Уладзімір, Фама, Феадосій

Бенядзікта (Бяніта), Дамініка, Івона (Іва), Марына, Софія (Соф'я, Сафія), Тамара, Феафанія (Феафана)

**30** Азарыя (Азарый), Аляксандр, Ананія (Ананій, Анань), Анісій, Антон, Ваўжынец, Гермес, Давід, Данііл (Даніэль), Іаан (Іван), Марцэлій, Медасей, Мікалай, Місаіл, Пётр, Рагер, Райнер, Рогер, Сабін, Севярын, Сергій (Сяргей), Сцяфан (Сцяпан), Фелікс, Эдвін, Юкунд, Яўгеній

Ірміна, Кацярына, Малгажата, Сабіна (Савіна), Севярына, Яўгенія

**31** Віктар (Віктарын), Іаан (Іван, Ян), Ілія (Ілья), Іосіф (Юзаф), Касторый, Кастул, Клаўдзій, Леапольд, Мадэст, Марк, Маркелін, Марыян, Мікалай, Міхаіл, Нікастрат, Севасціян (Севасцьян), Сергій (Сяргей), Сільвестр, Сіман, Сімфарыян, Сімяон (Сымон, Сямён), Транквілін, Уладзімір, Фадзей, Флор, Францыск (Францішак), Цівурцій

Вера, Гертруда, Гілярыя, Даната, Зоя, Ірміна, Калумба, Кацярына (Кая), Меланія (Мелання, Малання), Марыя, Паўліна, Сатарніна (Сатурніна), Серафіма

# ПАХОДЖАННЕ І ЗНАЧЭННЕ ЎЛАСНЫХ АСАБОВЫХ ІМЁН

## МУЖЧЫНСКІЯ ІМЁНЫ

### А

**Аарон**, Ароній — адукаваны чалавек, настаўнік (яўр.)

**Аба** — рэдк.

**Абакум**, *гл.* Авакум

**Абдон** — раб Суддзі, Бога (яўр.)

**Абелярд** — пчаляр (франц.)

**Абон** — бацька (арам., грэч., лац.)

**Абраам**, *гл.* Аўраам

**Абрам**, *гл.* Аўрам

**Абрамій**, *гл.* Аўрам

**Абундзій**, *гл.* Авундзій

**Авадон** — слуга Божы (халдз.)

**Авакір** — рэдк.

**Авакум** *прар.*, Абакум — моцны, змагар, любоў Божая (яўр.)

**Авель** — лёгкі павеў ветру (ст.-яўр.), імя сына Адама — першага чалавека на Зямлі

**Аверкій**, Аверый, Авяр'ян — той, хто ўтрымлівае, аддаляе (лац.)

**Аверый**, *гл.* Аверкій

**Авід** — работнік, бацька ведаў (перс., яўр.)

**Авідзій** — авечка (лац.)

**Авім** *мак.* — подых, павеў (грэч.); сход (яўр.)

**Авісалон** — бацька свету (ст.-яўр.); гаспадар спакою (яўр.)

**Авіў** — зялёны спеючы колас; які нарадзіўся ў час, калі спеюць каласы (яўр.)

**Авудзім** — усхваленне, услаўленне (грэч.)

**Авундзій**, Абундзій — шчодры, багаты (лац.)

**Авянір** — бацька святла; Бог ёсць святло (яўр.)

**Авянцін** — імя ад назвы аднаго з сямі ўзгоркаў Рыма (лац.)

**Авярцін** — той, хто папярэджвае (лац.)

**Авяр'ян**, *гл.* Аверкій

**Агава**, *гл.* Агаў

**Агап**, *гл.* Агапій

**Агапей**, *гл.* Агапій

**Агапій**, Агапей, Агап — любоў, любімы (грэч.)

**Агапіт** — любасны, улюбёны (грэч.)

**Агапон**, *гл.* Агафон

**Агаў** *ап.*, Агава — саранча (яўр.)

**Агафадор** — добры дар (грэч.)

**Агафангел** — добры веснік (грэч.)

**Агафапод**, Агафопус — мае добрыя ногі (грэч.)

**Агафон**, Агапон — добры, дабрадзейны (грэч.)

**Агафонік** — добры пераможца (грэч.)

**Агафопус**, *гл.* Агафапод

**Агей** *прар.* — урачысты, святочны (яўр.)

**Агілій** — грамада, таварыства (лац.)

**Аглаій**, Аглай — юнак (яўр.); светлы, радасны, бліскучы (грэч.)

**Аглай**, *гл.* Аглаій

**Агн**, Агній — беззаганны (грэч.); ягня (лац.)

**Агній**, *гл.* Агн

**Аграфій** — узвышаны (араб.)

**Агрыкол** — той, хто працуе на зямлі (лац.)

**Агрыпа**, Агрыпін — дзіця, народжанае ножкамі ўперад (грэч.)

**Агрыпін**, *гл.* Агрыпа

**Адальберт** — высакародны, бліскучы (ням.)

**Адам** — узяты з зямлі (яўр.)

**Аданай** — мой Гасподзь, Уладыка (яўр.)

**Адаўкт**, Давікт — памножаны (лац.)

**Адзікій** — адмаўляць, які адмаўляецца (лац.)

**Адольф** — высакародны, шляхетны; воўк (ст.-герм.)

**Адон**, Адоніс — пан, уладар (ст.-яўр.)

**Адоніс**, *гл.* Адон

**Адрыян** — мужны, моцны, смелы (грэч.); з італійскага горада Адрыі (лац.)

**Адылон** — атрыманы ў спадчыну, спадчынны (кельцк.)

**Адэадат** — Божы дар (лац.)

**Адэльгар** — слаўны, знакаміты + + войска (герм.)

**Адэльфій** — таварыскі чалавек (грэч., лац.)

**Ад'ютус** — дапамога (лац.)

**Аза** — моцны, магутнасць (яўр.)

**Азадан** — сухі, звялы; з Азаніі (грэч.)

**Азар**, *гл.* Азарыя

**Азарый**, *гл.* Азарыя

**Азарыя** *прар.*, Азар, Азарый — дапамога Божая (яўр.)

**Азат** — свабода (перс., грэч.); вызвалены (перс.)

**Айфал** — заўсёды белы, светлы (перс., грэч.); прынесены Богам (перс.)

**Ака**, *гл.* Акакій

**Акакій**, Ака — бязвінны, незласлівы (грэч.)

**Акепсій** — непахісны (грэч.)

**Акепсім** — насмешнік (перс., грэч.)

**Акзельм** — імя ад сканд. *Акзель*

**Акіла** *ап.*, Акула — арол (лац.)

**Акім**, *гл.* Іаакім

**Акімфій**, *гл.* Іаакім

**Акіндзін**, Акундзін — бязбедны; бяспечны (грэч.)

**Акінф**, *гл.* Акінфій

**Акінфій**, Акінф — яхант (грэч.)

**Аконцій** — імя героя старажытнагрэчаскага міфа (грэч., лац.)

**Аксенцій**, *гл.* Аўксенцій

**Аксён**, *гл.* Аўксенцій

**Аксій** — дастойны, варты (грэч.)

**Актавіян** — які належыць да рымскага роду Актавія; восьмы (лац.)

**Акула**, *гл.* Акіла

**Акундзін**, *гл.* Акіндзін

**Акурсій** — парывісты (лац.)

**Акуцён** — які заахвочвае, падтрымлівае; дасціпны, жартаўнік (лац.)

**Акцябрын** — імя ад спалучэння слоў *Октябрьская революция* (рус.)

**Алаіз**, *гл.* Алаізій

**Алаізій**, Алаіз — мудры (ст.-герм.)

**Алан** — скала (кельцк.); надзвычайны, прыстойны (іран.)

**Алаферн** — імя асірыйскага палкаводца, які стаяў на чале арміі Навухаданасара падчас заваявання Іўдзеі (ст.-яўр.)

**Алег** — ад старажытнаскандынаўскага імені *Негле* (святы, свяшчэнны); магчыма, ад імені *Вольга*

**Алесь**, *гл.* Аляксандр

**Алівер** — гаспадар аліўкавых дрэў, на якіх растуць масліны (лац.)

**Алім** *мак.* — памазаны (яўр.)

**Алімп** *ап.* — жытло багоў (грэч.); імя ад назвы гары Алімп

**Алімпан** *ап.* — нябесны, светлы (грэч.)

**Алімпій**, Алімпіян — алімпійскі, нябесны (грэч.)

**Алімпіян**, *гл.* Алімпій

**Алінархій** — рэдк.

**Аліп**, *гл.* Аліпій

**Аліпій**, Аліп — безжурботны (грэч.)

**Аліскер** — асвядомлены, які ведае (араб.)

**Аліфер**, Аліхвер — свабодны, вольны (грэч.)

**Аліхвер**, *гл.* Аліфер

**Аліцій** — ісціна (грэч.)

**Алоній** — адзінокі (лац.)

**Алфей** *ап.*, Алфій — перамена (яўр.)

**Алферый**, Алфёр — свабодны, вольны, які мае права быць вольным (грэч.)

**Алфёр**, *гл.* Алферый

**Алфій**, *гл.* Алфей

**Альбан** — які паходзіць з Альбы (лац.)

**Альберт** — знакаміты, выбітны, шляхетны (герм., ням.)

**Альбін** — белы чалавек са светлымі валасамі (лац.)

**Альбрэхт** — шляхетны; бліскучасты, прамяністы (герм., ням.)

**Альбярцін** — шляхетны, ззяе шляхетнасцю (герм., ням.)

**Альбярык** — кароль эльфаў (герм.)

**Альвіян** — багаты, белаваты (лац.)

**Альгерд** — высакародны, прыстойны, хуткі (ст.-герм.)

**Альдаральд** — арол, які ляціць (герм.)

**Альмахій** — прозвішча роду Гусцыяў (лац.)

**Альпін**, *гл.* Альпіній

**Альпіній**, Альпін — шляхетны прыяцель (герм., ням.)

**Альтман** — стары мужчына (герм.)

**Альфонс** — хуткі, спрытны, лоўкі (ст.-герм.)

**Альфрэд** — савет, думка + увесь свет (ст.-герм.)

**Аляксандр**, Алесь — мужны, абаронца людзей (грэч.)

**Аляксей**, Аляксій — абаронца (грэч.); памочнік, дапамога (лац.)

**Аляксій**, *гл.* Аляксей

**Амабіль** — мілы, варты кахання (лац.)

**Амадэй** — любы Богу (лац.)

**Аманаф**, Аманафа — нябачны, тайны, скрытны (грэч., лац.); ад імя вярхоўнага бажаства старажытных егіпцян

**Аманафа**, *гл.* Аманаф

**Аманд** — варты любві, ласкавы (лац.)

**Аманіт** — бездакорны майстар (яўр.); выдатны, беззаганны (грэч.)

**Аманцій**, Амат — мілы, каханы (лац.)

**Амарант** — незгасальны (грэч.)

**Амат**, *гл.* Аманцій

**Амброс**, *гл.* Амвросій

**Амбросій**, *гл.* Амвросій

**Амвросій**, Амбросій, Амброс — неўміручы, Божы (грэч.)

**Аміян** — рэдк.

**Амон**, Амона, Амоній, Амун — пясчаны (егіп.); выдатны майстар, пастаянны, верны (яўр.); нябачны, тайны (грэч., лац.)

**Амона**, *гл.* Амон

**Амоній**, *гл.* Амон

**Амос** *прар.* — моцны, цяжка нагружаны, які нясе цяжкую ношу (грэч.)

**Амплей**, *гл.* Амплій

**Амплій** *ап.*, Амплей — вялікі, значны, які займае ганаровую пасаду (лац.)

**Амун**, *гл.* Амон

**Амфілох**, *гл.* Амфілохій

**Амфілохій**, Амфілох, Амфін — той, што сядзіць у засадзе (грэч.)

**Амфін**, *гл.* Амфілохій

**Амфія**, Амфіян — высокі, акружаны з абодвух бакоў (грэч.); імя міфічнага заснавальніка Фіў (грэч.)

**Амфіян**, *гл.* Амфія

**Амяфіт** — рэдк.

**Анаклет** — які заклікае (грэч.)

**Ананій**, *гл.* Ананія

**Ананія** *ап.*, Ананій, Анань — дар Божы, каго Бог дараваў і ахоўвае (яўр.)

**Анань**, *гл.* Ананія

**Анастас**, *гл.* Анастасій

**Анастасій**, Анастас — уваскрэшаны, уваскрэсенне (грэч.)

**Анатолій**, Анатоль — узыходзячы, усход сонца (грэч.)

**Анатоль**, *гл.* Анатолій

**Ангелій** — пасланец, пасланнік, вястун (грэч.)

**Ангеляр**, *гл.* Ангелярый

**Ангелярый**, Ангеляр — анёльскі (балг.); вястун (грэч.)

**Ангій** — пасудзіна, вадаём, рэчышча (грэч.); святочны (яўр.)

**Ангільберт** — імя ад назвы аднаго з плямён + светлы (герм.)

**Андрон**, *гл.* Андронік

**Андроній**, *гл.* Андронік

**Андронік** *ап.*, Андрон, Андроній, Андрос — пераможца мужоў (грэч.)

**Андрос**, *гл.* Андронік

**Андрыян** — Андрэеў (грэч.)

**Андрэй** *ап.* — мужны, храбры, адважны (грэч.)

**Анект** — цярпімы, нядрэнны (грэч.)

**Анемпадзіст** — бесперашкодны (грэч.)

**Анепсій** — пляменнік (грэч.)

**Анзгар**, Оскар, Аскар — кап'ё Божае (ст.-герм.)

**Анікей**, *гл.* Іаанікій

**Анікій**, *гл.* Іаанікій

**Анікіта**, Аніцет — непераможны (грэч., лац.)

**Анін** — узвышаны, няшкодны (грэч.)

**Анісій** — карысць (грэч.)

**Анісім** *ап.* — выкананне, завяршэнне (грэч.)

**Анісіфар** *ап.* — карысны, які прыносіць карысць (грэч.)

**Аніцет**, *гл.* Анікіта

**Аніян** — засмучваць (грэч.)

**Анкудзін** — бяспечны (грэч.)

**Анос** — імя аднаго з сыноў Ваанія, які меў іншапляменных жонак і адпусціў іх разам з дзецьмі ў час Ездры (яўр.)

**Ансберт** — Бог + ясны, светлы (герм.)

**Ансгарый** — той, хто атрымаў кап'ё (герм.)

**Ансельм** — Бог яго ахова (ням.)

**Антанін** *мак.* — першародны (грэч.); Антоніеў (лац.)

**Антон**, *гл.* Антоній

**Антоній**, Антон — пераўзыходзячы (лац.), атрыманы ўзамен (грэч.)

**Антроп** — ветлівы (грэч.)

**Антыёх**, Анцівох — які едзе насустрач, або той, хто адмаўляецца ад ежы (грэч.)

**Антэльм** — шляхетны абаронца (ням.)

**Антэрос**, Анфір — квітнеючы (грэч.)

**Анувій** — ад імя егіпецкага бога Анубіса (егіп.)

**Анурый** — які пазірае ўверх (грэч.)

**Ануфрый** — свяшчэнны егіпецкі бык (егіп.); які мае асла (грэч.)

**Анфал** — бессмяротны, які вечна цвіце (грэч.)

**Анфіл** — рэдк.

**Анфім**, Анхім — высакаслаўны або квітнеючы, пакрыты кветкамі (грэч.)

**Анфіпат** — начальнік вобласці (грэч.)

**Анфір**, *гл.* Антэрос

**Анхім**, *гл.* Анфім

**Анцівох**, *гл.* Антыёх

**Анцігон** — той, хто супраць (грэч.)

**Анцід** — з сям'і Антыдыусаў (грэч.)

**Анцім** — кветка (грэч.)

**Анцімон** — замест гаспадыні (грэч., лац.)

**Анціп**, *гл.* Анціпій

**Анціпа**, *гл.* Анціпій

**Анціпатр** — замест бацькі, як бацька (грэч.)

**Анціпій**, Анціп, Анціпа — упарты, моцны, супраць усяго; які адбівае ўдары (грэч.)

**Анціх**, *гл.* Анціхей

**Анціхей**, Анціх — той, хто ідзе насустрач (грэч.)

**Анямонд** — ветраны (грэч.)

**Апалінар**, *гл.* Апалінарый

**Апалінарый**, Апалінар — той, хто губіць вайною (грэч.)

**Апалон**, *гл.* Апалоній

**Апалоній**, Апалон, Эпалоній — караблезнішчальнік (грэч.); Апалонаў (лац.)

**Апалос** *ап.* — згубнік, які знішчае чарадзейства (грэч.)

**Апанас**, *гл.* Афанасій

**Апат**, *гл.* Іпацій

**Апелес**, *гл.* Апелій

**Апелій** *ап.*, Апелес — удзельнік народнага сходу (грэч., лац.)

**Апенцій** — рэдк.

**Апол** — імя бога мудрасці або апекуна прыгожых мастацтваў (грэч.)

**Апраніян** — непрадбачаны, бесклапотны або роўны (грэч.)

**Аргей** — грэчаскі; ясны, бліскучы (грэч.)

**Ардаліён**, Ардальён — посуд для акраплення (грэч.); клапатлівы чалавек (лац.)

**Ардальён**, *гл.* Ардаліён

**Аркадзій**, Аркадзь — пастух, ураджэнец Аркадзіі (грэч.)

**Аркадзь**, *гл.* Аркадзій

**Аркесілай** — імя правадыра беатыйцаў пад Трояй; імя старажытнага грэчаскага акадэміка (грэч.); імя консула Рымскай імперыі 267 г. (лац.)

**Армель** — удавец (арам.)

**Армін** — воін (герм.)

**Арнольд** — арол + уладарыць (ст.-герм.)

**Арнульф** — моцны, кемлівы (ням.); арол + воўк (герм.)

**Аронас** — пад сузор'ем Арыён (грэч.)

**Ароній**, *гл.* Аарон

**Арпіл**, *гл.* Арпіла

**Арпіла**, Арпіл — выкрадальнік (герм.)

**Арсакій** — імя заснавальніка Парфянскага царства (грэч.)

**Арсацій** — мужчына (перс., грэч., лац.)

**Арсен**, *гл.* Арсеній

**Арсеній**, Арсен, Арсенцій — мужны, узвышаны мужчына (грэч.)

**Арсенцій**, *гл.* Арсеній

**Артамон**, Арцямон — ветразь (грэч.)

**Артур** — мядзведзь (кельцк.)

**Архелій**, Архілій — начальнік сонца (грэч.)

**Архілій**, *гл.* Архелій

**Архіп** *ап.* — начальнік над коньмі, старшы коннік (грэч.)

**Арцема** *ап.*, Арцемій, Арцём — здаровы, непашкоджаны; прысвечаны Арцямідзе — багіні палявання і месяца (грэч.)

**Арцемідор** — дар багіні Арцяміды (грэч.)

**Арцемій**, *гл.* Арцема

**Арцём**, *гл.* Арцема

**Арцяміd** — чысты, нявінны (яўр.); здаровы, належыць Арцямідзе (грэч.)

**Арцямон**, *гл.* Артамон

**Арчыл** — рэдк. (груз.)

**Арывон**, Арыён — імя велічнага волата і паляўнічага (грэч.)

**Арыён**, *гл.* Арывон

**Арый**, Арыян — прысвечаны богу вайны (яўр.)

**Арыс** — маўчанне (яўр.); ад імя бога вайны Арыса (Марса) (грэч.)

**Арыст**, *гл.* Арыстаклей

**Арыставул** *ап.* — найлепшы дарадца (грэч.)

**Арыстаклей**, Арыстоклій, Арыст — цудоўны, дабраслаўны (грэч.)

**Арыстарх** *ап.* — выдатны начальнік (грэч.)

**Арыстоклій**, *гл.* Арыстаклей

**Арыстон**, *гл.* Арыстыён

**Арыстыён**, Арысціён, Арыстон — узнагарода або вытанчаны, самы лепшы (грэч.)

**Арысцід** — лепшы, найлепшы (грэч.)

**Арысціён**, *гл.* Арыстыён

**Арысціп** — лепшы конь; імя старажытнагрэчаскага філосафа (грэч.)

**Арыяльд** — слуга багоў (сакс.)

**Арыян**, *гл.* Арый

**Арэй** — залаты, залатаносны (лац.)

**Арэнцій**, Арэст — горны (грэч.)

**Арэс** — імя іўдзея, які з дзецьмі вярнуўся з Вавілонскага палону (яўр.)

**Арэст**, *гл.* Арэнцій

**Арэфа**, Арэфій — арол або араты (араб.)

**Арэфій**, *гл.* Арэфа

**Асаф** — збіральнік (ст.-яўр.)

**Асінкрыт** *ап.* — непараўнальны (грэч.)

**Асір** — шчаслівы, благаславенны (яўр.)

**Асіхар** — брат спевака або брат справядлівасці (яўр.); імя начальніка Саламонавага палаца

**Асія** *прар.* — выратаванне, дапамога (яўр.)

**Аскалон** — без убранства (грэч.)

**Аскар**, *гл.* Анзгар

**Асклiпiядот** — дар Эскулапа — бога лякарства (грэч.)

**Аскліяд** — нашчадак Асклепія ці Эскулапа (грэч.)

**Аскольд** — імя аднаго з першых кіеўскіх князёў

**Асон**, *гл.* Іасон

**Аспрэн** — назва месца сходаў хрысціян (лац.)

**Астап** — уваскрэшаны (грэч.)

**Астафій**, *гл.* Яўстафій

**Астрамір** — востры; нетрывалы мір (слав.)

**Астрыхій** — цвёрдае дрэва, бук (грэч.)

**Астыён**, Асціён — ветлівы, добрапрыстойны (грэч.)

**Астый** — гарадскі, пачцівы (грэч.)

**Астэрый**, Асцерый — зорны, усеяны зорамі (грэч.)

**Асцерый**, *гл.* Астэрый

**Асціён**, *гл.* Астыён

**Асціфей** — рэдк.

**Атабальд** — рэдк.

**Атаназій**, *гл.* Афанасій

**Атарах** — карона; ад назвы горада (яўр.)

**Атлант** — які падтрымлівае (грэч.)

**Атык**, Ацік — з Атыкі (грэч.)

**Аўгій** — які ззяе (грэч., яўр.)

**Аўгуст** — імя рымскага імператара падчас нараджэння Ісуса Хрыста (грэч.); вялікасны (лац.)

**Аўгусцін** — велічны, свяшчэнны (лац.)

**Аўда** — раб, слуга Божы (халдз.)

**Аўдамар** — старая спадчына (герм.)

**Аўдзей**, *гл.* Аўдзій

**Аўдзіес** — слуга Ісуса (яўр.)

**Аўдзій** *прар.*, Аудзей — слуга Гасподні (яўр.)

**Аўдзікій** — той, хто адмаўляецца, адпрэчвае (перс., лац.)

**Аўдзіфакс** — які слухае свяціла (лац.)

**Аўдзялай** — народавяшчальнік (перс.); голас народа (грэч.)

**Аўдон** — раб суддзі (яўр.)

**Аўксенцій**, Аксенцій, Аксён — той, хто ўзрастае (грэч.)
**Аўкт** — памножаны, павялічаны (лац.)
**Аўнарый** — здрадны + войска (герм.)
**Аўпей** — вольны (герм., ням.)
**Аўраам**, Аўраамій, Абраам — бацька многіх народаў (яўр.)
**Аўраамій**, *гл.* Аўраам
**Аўрам**, Аўрамій, Абрам, Абрамій — бацька высокі, вялікі (яўр.)
**Аўрамій**, *гл.* Аўрам
**Аўрэлій** — залацісты, залаты (грэч., лац.)
**Аўрэліян** — які належыць да роду Аўрэлія; залаты (лац.)
**Аўтаном** — самастойны (грэч.)
**Аўцій** — цар (лац.)
**Афалай** — рэдк.
**Афанасій**, Атаназій, Апанас — несмяротны, неўміручы (грэч., лац.)
**Афінаген** — у Афінах народжаны; нашчадак багіні мудрасці Афіны (грэч.)
**Афінадор** — дар багіні мудрасці Афіны (грэч.)
**Афіновій** — імя пасланца сірыйскага цара Антыёха VII да іўдзейскага першасвятара Сімана (II ст. да н. э.; яўр.)
**Афон**, *гл.* Афоній
**Афоній**, Афон — шчодры, багаты, незалежны (грэч.)
**Афраат** — паходзіць з Афрыкі (лац.); імя святога IV ст. да н. э., які адыграў вялікую ролю ў станаўленні сірыйскай царкоўнай пісьменнасці (сір.)
**Афрадзісій** — народжаны на свята Афрадзіты (грэч.)
**Афрыкан** — афрыканскі (лац.)
**Ахаз** — уладар (яўр.); які ахоўвае (ст.-яўр.)
**Ахаік** *ап.* — ахейскі, грэчаскі (грэч.); сумны (яўр.)
**Ахар** — бунтаўшчык (яўр.)
**Ахард** — моцны канец мяча (герм.)
**Ахемянід** — з краіны Ахемянідаў (перс.); імя праведнага Ахемяніда персідскага
**Ахій**, *гл.* Ахія
**Ахікам** — Бог умацоўвае, настаўляе (яўр.)
**Ахіл**, *гл.* Ахілій
**Ахіла**, *гл.* Ахілій
**Ахілій**, Ахіла, Ахіл — без ежы (грэч.); імя героя Траянскай вайны (грэч.)
**Ахілуд** — брат народжанага (яўр.)
**Ахім**, Ахімей — усталяванне, замацаванне (яўр.)
**Ахімей**, *гл.* Ахім
**Ахісамах** — Бог падтрымлівае (яўр.)
**Ахісар** — брат спевака або брат справядлівасці (яўр.); імя начальніка Саламонавага палаца
**Ахія** *прар.*, Ахій — сябра Госпада (яўр.)
**Ахіян** — брат маці (яўр.)
**Ацій** — той, хто нападае, імклівы (грэч.)
**Ацік**, *гл.* Атык
**Аціан** — які належыць бацьку (лац.)
**Ацыскл** — рэдк.
**Аэцій** — арол (грэч.)
**Аяндор** — рэдк.

# Б

**Бабілій** — брама Божая (асір.)
**Бавон** — смелы, энергічны, паходзіць з Баварыі (ням.)
**Багалеп**, *гл.* Феапрэпій
**Багдан** — славянскі пераклад імені Феадот; Богам дадзены (грэч.); *гл.* Феадосій
**Багуміл** — любы Богу, багацце, шчасце (слав.)
**Багуслаў** — шчасце, слава (слав.)
**Бажыдар** — дар Бога (слав.)
**Бажымір** — Божы + спакой, мір (слав.)
**Бажыслаў** — Божы + слава (слав.)
**Бажэн** — надзвычайны, чароўны (грэч.); абраны Богам (слав.)
**Базыль**, *гл.* Васілій
**Балтазар**, Балтасарый — Божа, абараняй яго жыццё (асір., яўр.)
**Балтасарый**, *гл.* Балтазар
**Бальдвін** — адважны, смелы + + прыяцель (герм.)
**Баляслаў** — той, хто можа дасягнуць вялікай славы (слав.)
**Банавентурый** — добрая будучыня, добры лёс (лац.)
**Баніфат**, *гл.* Баніфацый
**Баніфацый**, Баніфат, Ваніфацый, Ваніфат — які творыць дабро (лац.)
**Банóній** — сын маёй журбы (яўр.)
**Банфілій** — добры сын (лац.)
**Барамей** — рэдк.
**Барбат** — барадач (лац.)
**Бардон** — тапор ваенны; воўк (герм.)
**Барзамір** — рэдк.
**Барнаба**, *гл.* Варнава
**Баронцій** — сын Онція (арам.)
**Барталамей**, *гл.* Варфаламей
**Барыс**, *гл.* Барыслаў
**Барыслаў**, Барыс — змагар за славу (слав.)
**Басьян** — славенская форма імені *Себасцьян*; варты пашаны (грэч.)
**Баўдалін** — мужны, смелы (герм., лац.)
**Баян** — бой, барацьба, баец (слав.); храбры воін (балг.)
**Бегуай** — рэдк.
**Бенвянут**, *гл.* Бенвянуцій
**Бенвянуцій**, Бенвянут — той, каго прыемна бачыць (лац., іт.)
**Беньямін**, *гл.* Веніямін
**Бенядзікт**, Венядзікт, Венядзей, Ведзяней — благаслаўлёны, які жадае дабра (лац.)
**Бернардзін** — воін, герой (ст.-герм.)
**Бертуін** — слаўны сябар, добры таварыш (герм.)
**Берцін** — бліскучы (герм.)
**Бідзіна** — рэдк. (груз.)
**Білій** — той, хто дае прытулак (герм.)
**Бірын** — русы (лац.)
**Болдыр** — рэдк. (слав.)
**Боній** — добры (лац.)
**Брандан** — князь (герм.)
**Браніслаў** — абараняць + слава (слав.)
**Бранка** — рэдк.
**Братуміл** — любы брату (слав.)
**Браўліён** — ззянне (герм.)
**Браўлій** — неўтаймаваны (ст.-герм.)

**Брачыслаў** — бразгаць + слава (балг.)

**Бруна** — загарэлы, смуглы (ням.)

**Брунольф** — буры воўк (герм.)

**Брунон** — буры мядзведзь (ням.)

**Брытоній** — паходзіць з брытаў (кельцк.)

**Будай** — які рана ўстае і ўсіх будзіць (слав.)

**Будзімір** — будзіць, не спаць + + спакой (слав.)

**Будзіслаў** — будзіць, не спаць + + слава (слав.)

**Бурхард** — дзейсная ахова (герм.)

**Бэда** — вайна, змаганне (герм.)

**Бяацій** — багаты, шчаслівы (лац.)

**Бякір** — даследчык, які штонебудзь вывучае (араб.)

**Бянігн**, *гл.* Бянігній

**Бянігній**, Бянігн — добры, прыветлівы, паслужлівы (лац.)

**Бянільд** — які змагаецца за добрае (кельцк.)

**Бянон** — сын маёй журбы (яўр.)

**Бярард**, *гл.* Бярнард

**Бярнадзій**, *гл.* Бярнард

**Бярнард**, Бярнардзій, Бярнадзій, Бярард — той, хто мае мядзведжую сілу, адважны (герм., ням.)

**Бярнардзій**, *гл.* Бярнард

**Бяртольд** — бліскучы; той, хто пануе (герм., ням.)

**Бяртранд** — светлы воран (герм.)

**Бярхарый** — слаўны, вядомы + + войска (герм.)

**Бяссон** — такое імя давалі неспакойнаму дзіцяці (слав.)

# В

**Вавіла** — паўстанец, змяшэнне (яўр.)

**Вагатай** — рэдк.

**Вадзім** — арганізатар, завадатар, важак (рус.); абвінаваўца (ст.-перс.)

**Вадзіслаў** — валодае славай (слав.)

**Вакула** — арол (лац.)

**Вакх** — імя бога віна і весялосці; нястрымны (грэч.)

**Валент**, *гл.* Валенцій

**Валента**, *гл.* Валенцій

**Валенцій**, Валента, Валент, Уалент — моцны, магутны, дужы (лац.)

**Валерый** — бадзёры, моцны, здаровы (лац.)

**Валерыян**, Валяр'ян — мужны, з Валерыі (лац.)

**Вальдэмар** — вялікі, славуты (герм.); панаваць (ст.-герм.)

**Вальтар**, Вальтэр — той, хто кіруе (герм., ням.)

**Вальтэр**, *гл.* Вальтар

**Вальфрам**, *гл.* Вульфрам

**Вальфрыд** — воўк + мір, спакой (ст.-герм.)

**Валюціян** — шыбкі; сын, унук (лац.)

**Валянцін** — здаровы, дужы (лац.)

**Валяр'ян**, *гл.* Валерыян

**Ванг** — бунтаўшчык (ст.-слав.)

**Ваніфат**, *гл.* Баніфацый

**Ваніфацый**, *гл.* Баніфацый

**Ванхіяс** — рэдк.

**Ваптос** — пагружаны або пафарбаваны; крыніца (грэч.)

**Варадат** — які мае даходы, імпартныя тавары (араб., перс.)

**Варак** — маланка (яўр.)

**Вараксій**, *гл.* Варахііл

**Варахііл** *арх.*, Вараксій, Варахій, Варахісій — Богам благаславёны (яўр.)

**Варахій**, *гл.* Варахііл

**Варахісій**, *гл.* Варахііл

**Варвар**, *гл.* Варварый

**Варварый**, Варвар — чужаземец (грэч.); грубы (лац.)

**Варкос** — жывапісец (яўр.)

**Варлаам**, Варлам — сын Божы (халдз.)

**Варлам**, *гл.* Варлаам

**Варлампій** — мажны, сыты (халдз.)

**Варлен** — энергічны (лац.)

**Варнава** *ап.*, Барнаба — сын суцяшэння (яўр.)

**Варсава** — сын сабы (народ у Фрыгіі); сын суботы (арам.)

**Варсаміт** — рэдк.

**Варсаноф**, *гл.* Варсанофій

**Варсанофій**, Варсаноф — сын ваеннага падраздзялення (арам.)

**Варсімей** — злы (грэч.)

**Варсіс** — магчыма, скарачэнне імені *Варсанофій* (арам.)

**Варул** — раб Божы (яўр., сір.); Божы сын (арам.)

**Варун** — які бароніцца ад чагосьці (герм.)

**Варух** *прар.* — благаславёны (яўр.)

**Варфаламей** *ап.*, Барталамей — сын Фаламея (яўр.)

**Варыпсаў** — недакранальны (грэч.)

**Вас** — магчыма, краіна пустая (лац.); імя бога вятроў Васа (герм.); вытворнае ад імя *Васілій*

**Васілід** — цароў, царэвіч (грэч.)

**Васілій**, Васіль, Базыль — царскі (грэч.)

**Васіліск** — царок (грэч.)

**Васіль**, *гл.* Васілій

**Васіян** — які належыць Васілію (лац.)

**Васнульф** — воўк бога вятроў Васа (герм.)

**Васой** — пустыня, пустынны (грэч.)

**Вата** — купіна (грэч.)

**Ваўжынец** — са старадаўняй мясціны Лаўрэнтум (лац.)

**Вафусій** — глыбокасутнасны, сур'ёзны, глыбокі (грэч.)

**Вахцісій** — шчасце (перс.)

**Вацлаў** — славуты (слав.)

**Ведзяней**, *гл.* Бенядзікт

**Велізар** — вялікі, велізарны (слав.)

**Велімір** — вялікі свет (слав.)

**Веліслаў** — вялікі + слава (слав.)

**Вендалін** — вандроўнік, паломнік, з племені вандалаў (ням.)

**Вендзіміян** — збіральнік вінаграду (лац.)

**Веніямін**, Веньямін, Беньямін — сын любімай жонкі, любімы сын (яўр.)

**Венцаслаў** — акружаны славай (слав.)

**Веньямін**, *гл.* Веніямін

**Венядзей**, *гл.* Бенядзікт

**Венядзікт**, *гл.* Бенядзікт

**Венядзім** — з племені вянедаў (старажытнага славянскага племені) (лац.)

**Венянон** — рэдк.

**Веракондт** — сапраўдны, праўдзівы + ахова (герм.)

**Верк**, Вяркей — нахілены, які кланяецца, пакланяецца (лац.)

**Вернер** — які папярэджвае войска (ст.-герм.)

**Весялін** — вясёлы, жыццярадасны (слав.)

**Вівіян** — жывы, жывучы, які жыве (лац.)

**Вігілій** — які клапоціцца, не спіць (лац.)

**Вігор** — улада, аўтарытэт (лац.)

**Візялін** — уладар (лац.)

**Вікенцій**, Вінцэнт, Івенцій — які перамагае (лац.)

**Віктар**, Віктрыцій, Віктарын — пераможца (лац.)

**Віктарын**, *гл.* Віктар

**Віктарыян** — які належыць Віктару (лац.)

**Віктрыцій**, *гл.* Віктар

**Вікул** — пастух, які пасвіць валоў (грэч.)

**Віл** — стары (грэч.); галоўны валадар (асір.)

**Вілен** — апека, дапамога (герм., ням.)

**Віліброрд** — воля + наканечнік стралы (герм.)

**Віліктон** — ад спалучэння *Владимир Ильич Ленин* (бурацк.)

**Вілорый** — ад *В.И. Ленин — организатор революции* (рус.)

**Вільбальд** — жаданне, смелы (ст.-герм.)

**Вільгельм** — воля, жаданне + + абарона, апека (герм., ням.)

**Вільфрыд** — воля + мір (герм.)

**Вільям**, Вілям — воля, жаданне + + апека (герм., ням.)

**Вільямір** — вялікі + мір (магчыма, венгерскі варыянт са славянскай мовы)

**Вілям**, *гл.* Вільям

**Віналій** — магчыма, варыянт імені *Віталій* (лац.)

**Вінок** — светлы ўнук (кельцк.)

**Вінфанцій** — рэдк.

**Вінцэнт**, *гл.* Вікенцій

**Віргілій** — быць квітнеючым, бадзёрым (лац.); моцны мужчына (кельцк.)

**Віргіній**, Вяргіній — пан, хлопец, малады чалавек (лац.)

**Вірылад** — мужчынскі, мужны (лац.)

**Вісарыён** — горны або лясны (грэч.)

**Вісон** — магчыма, імя ад назвы белай дарагой тканіны з бавоўны (яўр.)

**Вістан** — сябар + камень (герм.)

**Вістрамунд** — перад + ахоўнік (герм.)

**Віт** — пераможны, які жыве (лац.)

**Віталій**, Віталь — той, хто дае жыццё, здольны да жыцця (лац.)

**Віталіян** — Віталіеў

**Віталь**, *гл.* Віталій

**Вітаслаў** — жыццё + слава (лац., слав.)

**Вітаўт** — гнаць людзей (лац.)

**Вітольд** — які вядзе, суправаджае народ (літ.)

**Віфоній** — глыбінны, у глыбіню кінуты (грэч.)

**Віцініій** — лац., рэдк.

**Віянор** — дужы (грэч.)

**Войцех** — уцеха, пацеха; воін, змагар (слав.)

**Вольф** — воўк (ст.-герм.)

**Вольфганг** — воўк + хадзіць; воўчы ход (ст.-герм.)

**Восіп**, *гл.* Іосіф

**Вукашын** — воўчы, які належыць воўку (серб.)

**Вукол**, *гл.* Вукола

**Вукола**, Вукол — пастух (грэч.)

**Вульфрам**, Вальфрам — воўк + + крук (герм.)

**Вунібальд** — смелы, адважны сябар (сакс.)

**Вышаслаў** — які мае вялікую славу (слав.)

**Вянанцій**, Вянапцій — лавец, паляўнічы, які палюе (лац.)

**Вянапцій**, *гл.* Вянанцій

**Вяран** — справядлівы (лац.)

**Вяргіній**, *гл.* Віргіній

**Вяркей**, *гл.* Верк

**Вяслаў** — пан + слава (слав.)

**Вячаслаў** — слаўны, найслаўнейшы (слав.)

# Г

**Габрон** — мужны, смелы, храбры (араб.)

**Габрыель**, *гл.* Гаўрыіл

**Гавааф** — ад назвы старажытнага горада на Яфрэмавай гары ў Палесціне (яўр.)

**Гаваіл** — Бог высокі (яўр.)

**Гаваон** — узвышаны; ад назвы старажытнага ханаанскага горада (яўр.)

**Гавел** — чалавек з Галіі; чужы, прышэлец (ірл. з кельцк.)

**Гавін**, *гл.* Гавіній

**Гавіній**, Гавін — жыхар з Габіі; той, хто паходзіць з Габіі (лац.)

**Гавядай** — рэдк.

**Гаій** *ап.* — зямны (грэч.)

**Галакціён** — малочны (грэч.)

**Галганій**, Галганон — паходзіць з Галіі (лац.)

**Галганон**, *гл.* Галганій

**Галік** — светлы дом, святлісты (грэч.); паходзіць з Галіі (лац.)

**Гальдзін** — імя з мовы яўрэяў, якія перасяліліся на тэрыторыю Расіі (яўр.)

**Гамаліііл** — узнагарода Божая, Божы заступнік (яўр.)

**Ганарат** — паважаны, шанаваны (лац.)

**Ганібал** — дабрачынны, ласкавы чалавек (фінск.); ласка Божая (фінік.)

**Ганорый** — гонар, пашана, годнасць (лац.)

**Ганціёл** — які радуецца (грэч.)

**Гапей** — любімы, любоў (грэч.)

**Гаразд** — здольны (слав.); умелы (балг.)

**Гарацый** — чалавек з роду Гарацьюшаў (грэч., лац.)

**Гаргоній** — хуткі, імклівы; які належыць Гаргоне (грэч.)

**Гардзей**, Гардзій, Гордзій — грозны, хуткі; ад назвы сталіцы старажытнай Фрыгіі (грэч.)

**Гардзій**, *гл.* Гардзей

**Гардзіян** — з горада Гордзія; з Гардзіены — вобласці ў Вялікай Арменіі (грэч.)
**Гардон** — неразумны (франц.)
**Гарміздас**, Харміздас — добры (перс., лац.)
**Гарый** — памяншальная форма імені *Генрых* (ням.)
**Гасій** — рэдк.
**Гаспар** — вартаўнік скарбаў (балг.)
**Гастамысл** — госць + думка, мысль (ст.-руск.)
**Гастон** — лясны чалавек, жыхар Гасконіі (франц.)
**Гасцівіт** — гасцяваць + пан, гаспадар (слав.)
**Гасціміл** — гасцяваць + мілы (слав.)
**Гасцірад** — гасцяваць + рады (слав.)
**Гасціслаў** — гасцяваць + слава (слав.)
**Гаўдэнцій** — вясёлы, радасны (лац.)
**Гаўрыіл** *арх.*, Гаўрыла, Габрыель — муж Божы, моц Божая, Бог — мая дапамога (яўр.)
**Гаўрыла**, *гл.* Гаўрыіл
**Гаўсберт** — знакаміты гот (герм.)
**Гафтарыім** — рэдк.
**Гвальберт** — які танцуе, слаўны (герм.)
**Гвідон** — вучоны, выхаваны (ням.); дрэва, лес (ст.-герм.)
**Гдалій** — рэдк.
**Гедымін** — які памятае, шукае, распытвае пра каго-небудзь (літ.)
**Гедэон** — які валодае зброяй, разбуральнік (яўр.)
**Геладзій** — грэчаскі (грэч.)
**Геласій** — які смяецца (грэч.)
**Гелер** — рэдк. (кельцк.)
**Гелій** — сонца (грэч.)
**Гельмут** — здаровы, розум (герм.)
**Гелярын** — рэдк.
**Гемел** — двайнік, блізня (лац.)
**Гемініян** — які мае адносіны да двайнят, блізня (лац.)
**Генадзій**, Генадзь — высакародны (грэч.)
**Генадзь**, *гл.* Генадзій
**Геній** — чалавек, надзелены высокай адаронасцю (лац.)
**Генрых** — магутны, уладар (ням.)
**Георгій**, Юрый, Ягор — земляроб (грэч.)
**Герадот** — імя старажытнагрэчаскага вучонага — гісторыка (ст.-грэч.)
**Гераклій** — слава, гонар; які належыць Гераклу (ст.-грэч.)
**Геральд** — той, хто танцуе (герм.)
**Геранім**, *гл.* Іеранім
**Герард**, Жэрард — мужны лучнік (герм.)
**Герасім** — сумленны, шаноўны, чэсны (грэч.)
**Герберт** — знакаміты воін (герм.)
**Гервасій** — кап'яносец (герм.); ганаровы дар (грэч.)
**Геркулан** — Геракл + слава (грэч.)
**Гермаген**, Ермаген, Ермагена — нашчадак Гермеса (грэч.)
**Гермакрат**, Ермакрат — сіла, моц (грэч.); моц Гермеса (лац.)
**Герман** — родны, адзінародны брат (лац.)
**Гермес** — той, хто паказвае дарогу (грэч.)
**Гермянгільд** — бітва, змаганне (герм.)
**Герон** — апякун (герм.)
**Геронцій** — састарэлы, стары (грэч.)

**Гефест** — вулканічны; імя бога агню, Зеўса і Геры (грэч.)

**Гжыміслаў** — слава (ст.-польск.)

**Гіганцій** — іспалінскі, гіганцкі (грэч.)

**Гільберт** — праслаўлены шляхецтвам; надзвычайны лучнік (герм.)

**Гіляр**, *гл.* Гілярый

**Гілярый**, Гіляр — вясёлы, радасны (грэч.)

**Гімнасій** — які практыкуецца (грэч.)

**Гіяцынт** — імя выдатнага юнака, ператворанага богам Апалонам у кветку (грэч.)

**Глеб** — аддадзены пад абарону Бога (ст.-руск.)

**Глікер**, *гл.* Глікерый

**Глікерый**, Глікер — салодкі (грэч.)

**Гневамір** — гнеў + спакой (слав.)

**Гобан** — боскі каваль (герм., кельцк.)

**Горгій** — грозны, хуткі (грэч.)

**Гордзій**, *гл.* Гардзей

**Готард** — сіла, моц (ням.)

**Готфрыд** — якога Бог беражэ, ахоўвае Бог (ням.)

**Градзіслаў** — гарадзіць + слава (слав.)

**Граніслаў** — грань + слава (слав.)

**Гратус** — удзячны, паслужлівы (лац.)

**Грацыян** — прывабнасць, чароўнасць (лац.)

**Грыгорый**, Рыгор — які не спіць (грэч.)

**Грыміслаў** — грымець + слава (слав.)

**Губерт** — які мае ясны розум (герм.)

**Гугон** — быстры, праніклівы, разумны (герм.)

**Гуміліт** — пакорны (лац.)

**Гунтрам** — вайна + крук, груган (герм.)

**Гурый** *мак.*, Гур'ян — ільвяня (яўр.); прышэлец, чужынец (грэч.)

**Гур'ян**, *гл.* Гурый

**Густаў** — падпора (швед.); бітва + жазло (ст.-герм.)

# Д

**Дабраміл** — добры, мілы (слав.)

**Дабрамір** — добры, спакойны (слав.)

**Дабрамысл** — добры + мысль, думка (слав.)

**Дабранег** — добры + раскоша (слав.)

**Дабраслаў** — добрая слава (слав.)

**Дабрыня** — добры чалавек (слав.)

**Давід**, Давыд — любімы, каханы (яўр.)

**Давікт**, *гл.* Адаўкт

**Давін** — суддзя (яўр., лац.)

**Давыд**, *гл.* Давід

**Дада** — лучына, паходня (грэч.)

**Дакучай** — надакучлівы (ст.-слав.)

**Далат** — рэдк.

**Далмат**, *гл.* Далмацій

**Далмацій**, Далмат — з Далмацыі — мясцовасці на ўсходнім беразе Адрыятычнага мора (лац.)

**Дамарад** — дом + рады, здаровы (слав.)

**Дамас**, *гл.* Дамасій

**Дамасій**, Дамас — лагодны, прыручаны (грэч., лац.)

**Дамаскін** — з горада Дамаска (грэч., яўр.)

**Дамаслаў** — дом + слава (слав.)

**Дамецій**, Дзяменцій, Дземянцей — утаймоўшчык (лац.)

**Дамеціян** — Дамецieў; рымскае радавое імя; утаймоўшчык (лац.)

**Дамін**, Дамнін — гаспадар, валадар (лац.)

**Дамінік** — які належыць Богу, Хрысту (лац.)

**Даміян**, *гл.* Дзям'ян

**Дамнін**, *гл.* Дамін

**Дан** — суд, суддзя; ад імені *Даніiл* (яўр.)

**Данакс** — дараваны Богам (лац.)

**Данакт** — прысвечаны Зеўсу (грэч.)

**Данан** — карычневы (кельцк.)

**Данат** — падараваны (лац.)

**Даніiл** *прар.*, Даніла, Даніэль — суддзя Божы, Бог — мой суддзя (яўр.)

**Даніла**, *гл.* Даніiл

**Даніэль**, *гл.* Даніiл

**Дарафей**, Дароцій — дар Божы (грэч.)

**Дармідонт** — з кап'ём, добразычлівы (грэч.)

**Дарон** — дар, падарунак (яўр.)

**Дароцій**, *гл.* Дарафей

**Дарый** — цар, які валодае чымнебудзь, уладар (перс.)

**Дасій** — калматы (грэч.)

**Дасіфей** — дадзены Богам; *разм.* ад імені *Феадосій* (грэч.)

**Даўмонт** — вастрыё мяча (літ.)

**Даўрат** — рэдк.

**Дацій** — той, хто дае (лац.)

**Джон**, *гл.* Іаан

**Дземянцей**, *гл.* Дамецій

**Дзесідзерый**, Дысідэрый — жаданы (грэч.), жаданы сын (лац.)

**Дзідзім** — блізня (грэч.)

**Дзіега** — які навучае (грэч.)

**Дзіён** — імя ад назвы горада, боскі (грэч.)

**Дзізібод** — уладар народа (герм.)

**Дзізмас** — Добры Лотр (лац.)

**Дзій** — божы (грэч., лац.); эпітэт Зеўса (грэч.)

**Дзімітрый**, Дзмітрый — плод зямны, плод зямлі (грэч.)

**Дзімітрыян** — высокія землі (грэч.)

**Дзісан** — сувязны, які звязвае (грэч.)

**Дзіяген**, Дыяген — Зеўсаў нашчадак (грэч.)

**Дзіядор**, Дыядор — Божы дар (грэч.)

**Дзіядот**, Дыядот — Богам дадзены (грэч.)

**Дзіякліціян** — Зеўс + слава (грэч.)

**Дзіямід**, Дзямід — парада Божая (грэч.)

**Дзіяніс**, Дзіянісій, Дзяніс — імя бога жыццёвых сіл, прыроды, віна; пазней яго лічылі богам урадлівасці, цывілізацыі, шчасця; весялун (лац.)

**Дзіянісій**, *гл.* Дзіяніс

**Дзіяскор**, Дыяскор — сын Зеўса (Дзія) (грэч.)

**Дзмітрый**, *гл.* Дзімітрый

**Дзяменцій**, *гл.* Дамецій

**Дзямід**, *гл.* Дзіямід

**Дзям'ян**, Даміян — які належыць багіні Даміі (лац.); які ўтаймоўвае (грэч.)

**Дзяніс**, *гл.* Дзіяніс

**Дзяфенсар** — рэдк.

**Длугаслаў** — доўгі + слава (слав.)

**Домн**, *гл.* Домній

**Домній**, Домн — гаспадар, уладар (лац.)

**Дональд** — магутны, багаты ўладар свету (кельцк.)

**Дорыс** — падарунак (грэч.); імя можа належаць асобе жаночага полу

**Драгаміл** — дарагі, любы (слав.)

**Драгамір** — дарагі, спакой (слав.)

**Драгуцін** — дарагі (серб.); гэта імя даюць хлопчыкам, якія па паходжанні маюць сербскія карані

**Дрымент** — рэдк.

**Дукіцій** — даверлівы, легкаверны (грэч., лац.); правадыр (серб.)

**Дула** — раб, слуга (грэч.)

**Дульсід** — даліна (лац.)

**Дысідэрый**, *гл.* Дзесідзерый

**Дыяген**, *гл.* Дзіяген

**Дыядор**, *гл.* Дзіядор

**Дыядот**, *гл.* Дзіядот

**Дыяскор**, *гл.* Дзіяскор

**Дэаграцій** — удзячны Богу (лац.)

**Дэадат** — Богам дадзены (грэч.)

**Дэйкола** — які шануе Бога (лац.)

# Е

**Еварэст** — прыймальны, угодны (грэч.)

**Евель** — магчыма, паходзіць ад імені *Іаэль*, што ў перакладзе з іўрыта азначае *Усявышні*; голы, лысы (яўр.)

**Евіёт** — які лёгка здабывае сабе харчаванне (грэч.)

**Евіласій**, Эвіласій — ветлівы, мілы, добразычлівы (грэч.)

**Евяіл** — рэдк.

**Евялпіст**, Эвялпіст, Эвяліст — добранадзейны (грэч.)

**Егаваон** — рэдк.

**Езекііль**, *гл.* Іезекііль

**Езякія** — якім кіруе Бог, крэпасць Божая (яўр.)

**Езяхіль** — Бог ёсць сіла (яўр.)

**Ексакустадзіян**, Эксакустадзіян — вайсковы суддзя (грэч.); сын Эксуперанса (лац.)

**Елеазар** *мак.*, Елізар — Божая дапамога (яўр.)

**Елеанан** — рэдк.

**Елізар**, *гл.* Елеазар

**Елізбар**, Элізбар — рэдк. (груз.)

**Елій**, Элій — сонечны (грэч.); для каго Бог ёсць Ён (яўр.)

**Елісавет** — які шануе Бога (яўр.)

**Елісей** *прар.* — якога збавенне праз Бога, якога ратуе Бог (яўр.)

**Елпідзіфор**, Элпідзіфор — які абнадзейвае (грэч.)

**Елязвой** — імя эфіопскага цара (грэч.)

**Еляўсіп** — коннік (грэч.)

**Еляўферый**, Эляўтар, Эляўтарый — свабодны, вольны, варты быць вольным (грэч.)
**Еміліян**, Емяльян, Эміліян, Эмільян — які належыць Эмілію, прыняты ў род Эмілія; прыемны ў словах (грэч.)
**Емяльян**, *гл.* Еміліян
**Емярыкій**, Эмярык — заўсёды багаты (ням.); уладар (герм.)
**Енергіян** — дзеянне, дзейнасць (грэч.)
**Енікей**, *гл.* Іаанікій
**Енікій**, *гл.* Іаанікій
**Епафрас**, *гл.* Эпафрас
**Епікцет**, Эпікцет — набыты (грэч.)
**Епімах**, Эпімах — ваяўнічы, які аказвае ваенную дапамогу (грэч.)
**Епіфан**, *гл.* Епіфаній
**Епіфаній**, Епіфан — відны, знакаміты (грэч.)
**Ерамей**, *гл.* Іерамія
**Еранім**, *гл.* Іеранім
**Ерафей**, *гл.* Іерафей
**Ерм** *ап.*, Ерма — веснік, вястун (грэч.)
**Ерма**, *гл.* Ерм
**Ермаген**, *гл.* Гермаген
**Ермагена**, *гл.* Гермаген
**Ермакрат**, *гл.* Гермакрат
**Ермалай** — які абвяшчае штонебудзь народу (грэч.)
**Ермій** *ап.* — тлумачальнік (грэч.)
**Ермінінгельд** — спалучэнне слоў *Ірмін* (бог вайны) і *герой* (герм.)
**Еспер**, Эспер, Яспер — вечар (грэч.)
**Есявон** — бляск (яўр.)
**Еўдакім** — слаўны, акружаны гонарам (грэч.)
**Еўдаксій**, Яўдоксій — які карыстаецца добрай славай (грэч.)
**Еўнікей**, *гл.* Яўнікій
**Еўнікій**, *гл.* Яўнікій
**Еўнікіян**, *гл.* Яўнікій
**Еўпел**, *гл.* Еўпл
**Еўпл**, Еўпел — добры плывец (грэч.)
**Еўсігней**, Еўсігній, Еўсцігней, Яўсігній — добры сваяк (грэч.)
**Еўсігній**, *гл.* Еўсігней
**Еўстафей**, *гл.* Яўстафій
**Еўсхімон** — прыстойны, прывабны (грэч.)
**Еўсцігней**, *гл.* Еўсігней
**Еўсявон** *мак.* — поўны глыбокай павагі, надзейны (грэч.)
**Еўфіміян**, Еўхіміян — Яфімаў; дабрадушны (грэч.)
**Еўфрасін**, Ефрасім, Ефрасін, Яўфрасій, Яфрасій — радасны, вясёлы (грэч.)
**Еўхіміян**, *гл.* Еўфіміян
**Еўціхей**, *гл.* Яўціхій
**Еўціхіян**, *гл.* Яўціхій
**Ефрасім**, *гл.* Еўфрасін
**Ефрасін**, *гл.* Еўфрасін

# Ё

**Ёнаш**, *гл.* Іона

# Ж

**Жазеф** — памножаны (яўр.)

**Жан**, *гл.* Іаан

**Ждан** — якога чакаюць, чакаемы (ст.-слав.)

**Жэміслаў** — жадаць + слава (слав.)

**Жэрард**, *гл.* Герард

# З

**Завад** — падараваны Богам (грэч., яўр.)

**Завулон** — знак дару Божага; гаспадар (яўр.)

**Заіл** — які любіць жывёл (грэч.)

**Заір** — ціхі, лагодны, пакорлівы (араб.)

**Закхей** — праведны, справядлівы, чысты (сір., яўр.)

**Зарававаель** — народжаны ў Вавілоне; імя кіраўніка першага атрада іўдзеяў, якія вярнуліся з Вавілонскага палону ў Іерусалім (538 г. да н. э.)

**Зарвіл** — рэдк.

**Засім**, *гл.* Засіма

**Засіма**, Засім, Зосім, Ізосім — моцны ў жыцці, жывучы (грэч.)

**Заўдзіл**, Заўдзій — каго Іегова дараваў (яўр.)

**Заўдзій**, *гл.* Заўдзіл

**Захар**, *гл.* Захарыя

**Захарый**, *гл.* Захарыя

**Захарыя** *прар.*, Захарый, Захар — памяць Гасподняя (яўр.)

**Зацей** — задума, план (слав.)

**Збігнеў** — які пазбавіцца гневу (слав.)

**Збыслаў** — збыць + слава (слав.)

**Здзіслаў** — класці + слава (слав.)

**Зевін** — куплены, набыты (яўр.)

**Зевядзей** — дар Божы (яўр.); імя бацькі апосталаў Іакава і Іаана

**Земавіт** — асоба, пан, сям'я (слав.)

**Зефірын** — лёгкі заходні вецер (грэч., лац.)

**Зігмунд**, Зыгмунд — ахова, апека (герм., лац.)

**Зігфрыд** — устанаўленне спакою праз перамогу (ням.)

**Зілот** — прыхільнік, змагар, апякун (яўр.)

**Зімран** — якога славяць песнямі (яўр.)

**Зіна** *ап.* — надзвычайны, божы, ад імя *Зеўс* (грэч.)

**Зіновій** — які набожна жыве, жыве дзякуючы Богу (грэч.)

**Зінон** — Зеўсаў, боскі (грэч.)

**Зосім**, *гл.* Засіма

**Зот**, *гл.* Зоцік

**Зоцік**, Зот, Ізот — жыватворны, поўны жыцця (грэч.)

**Зыгмунд**, *гл.* Зігмунд

**Зянон** — рэдк. (груз.)

**Зянох** — дарослы, стары (кельцк.)

# І

**Іаад** *прар.* — Бог сведка, дабрачасны (яўр.)

**Іаакім**, Іакім, Іахін, Акім, Акімфій, Якім — Бог паставіў (яўр.)

**Іаан** *ап.*, Іаган, Іван, Джон, Жан, Яаній, Ян — ласка Божая, Бог мілуе (яўр.)

**Іаанан** — якога Іегова даў (яўр.)

**Іаанафан** — Бог даў (ст.-яўр.)

**Іаанікій**, Анікей, Анікій, Енікей, Енікій — Божая перамога (яўр.)

**Іаасаф**, Іасаф, Іасафат, Ісафат — Гасподзь суддзя (яўр.)

**Іавіл**, Іавілей — які належыць Зеўсу (грэч.)

**Іавілей**, *гл.* Іавіл

**Іаган**, *гл.* Іаан

**Іадай** — любімец Божы (яўр.)

**Іадор** — дар фіялак (грэч.)

**Іазаній**, *гл.* Іазанія

**Іазанія**, Іазаній — якога чуе Бог (яўр.)

**Іаіль** *прар.* — Іегова — Бог, Гасподзь Бог (яўр.)

**Іаір** — якога Бог заахвочвае, навучае (яўр.)

**Іакаў** *ап.*, Якаў, Якуб — перашкода; які ідзе следам за кім-небудзь (яўр.)

**Іакім**, *гл.* Іаакім

**Іакінор** — рэдк.

**Іакінф**, Іакінфій — гіяцынт (назва кветкі), яхант (грэч.)

**Іакінфій**, *гл.* Іакінф

**Іакісхол** — перашкаджальны, які перашкаджае (грэч.)

**Іамвліх**, Іямвліх — які любіць вершы (грэч.)

**Іанафан** — дар Божы (яўр.)

**Іанікіт**, *гл.* Іанікіта

**Іанікіта**, Іанікіт — непераможны (грэч.)

**Іануарый**, Януарый, Януар — вартаўнік брамы (лац.)

**Іарам** — Іегова высокі (яўр.)

**Іардан**, Ярдан — спадаць, гнаць уніз у яму (араб., яўр.); імя ад назвы свяшчэннай біблейскай ракі

**Іасаф**, *гл.* Іаасаф

**Іасафат**, *гл.* Іаасаф

**Іасія** *ап.* — якога падтрымлівае Бог (яўр.); праведны (лац.)

**Іасон** *ап.*, Ясон, Асон, Іясон — лекар (грэч.)

**Іаўліян** — рэдк.

**Іафет**, Яфет — пашырэнне, павелічэнне (ст.-яўр.); Бог распаўсюдзіць (яўр.)

**Іафор** — перавага (яўр.); імя цесця прарока Маісея

**Іахін**, *гл.* Іаакім

**Іван**, *гл.* Іаан

**Івенцій**, *гл.* Вікенцій

**Івон** — дрэва цісавае, кап'ё з дрэва цісавага (ням.); голуб (яўр.)

**Ігар** — ахоўваць (ст.-сканд.); ваяўнічы (сканд.); асцярожны, беражлівы (слав.)

**Ігафракс** — надзейна агароджаны (грэч.)

**Ігемон** — імя правіцеля Іўдзеі з тытулам пракуратара (грэч.)

**Ігнат**, *гл.* Ігнацій

**Ігнацій**, Ігнат — невядомы, вогненны (грэч.)

**Ігурый** — рэдк.

**Ідай** — урачыстасць у гонар Іеговы (яўр.); імя аднаго з 30

самых моцных воінаў цара Давіда

**Ідзій** — шчыт дубовы; народжаны каля Эгейскага мора (грэч.)

**Ідэал** — узор годнасці (франц.)

**Іегудзіїл** *арх.* — які славіць Бога (яўр.)

**Іезавель** — цярпець (фінік.)

**Іезекііль** *прар.*, Езекііль — Богам умацаваны (яўр.)

**Іераміїл** *арх.*, Іерамій — узвышэнне да Бога (яўр.)

**Іерамій**, *гл.* Іераміїл

**Іерамія** *прар.*, Ерамей — узвышаны Богам (яўр.)

**Іеранім**, Еранім, Геранім — чалавек, які носіць святое імя (грэч.)

**Іерафей**, Ерафей — асвячоны Богам (грэч., яўр.)

**Іерыіл** — навучаны Богам (яўр.)

**Ізарн** — зброя, арол (герм.)

**Ізмаіл**, Ісмаіл — чуе Бог, пачуе Бог (ст.-яўр.); аб якім малітвы бацькоў Бог пачуе (яўр.)

**Ізосім**, *гл.* Засіма

**Ізот**, *гл.* Зоцік

**Ізраіль** — які змагаўся супраць Бога (яўр.)

**Ізяслаў** — слава, які здабывае славу (слав.)

**Іларыён**, Іларый, Ларыён — ціхі, радасны, вясёлы (грэч.)

**Іларый**, *гл.* Іларыён

**Ілій** — сонца (грэч.)

**Ілірык** — з краіны Ілірыі (грэч.)

**Ілія** *прар.*, Ілья, Ілля — моц, крэпасць Божая (яўр.)

**Іліядор** — дар сонца (грэч.)

**Ііліян** — сонечны (грэч.)

**Ілля**, *гл.* Ілія

**Ільдэфонс** — гатовы да бітвы (герм., ням.)

**Ілья**, *гл.* Ілія

**Імяней** — імя сына багіні Гімянеі (грэч.)

**Іна** — чыстая вада (готф.); бурлівы паток (грэч.)

**Інакенцій** — бязвінны (лац.)

**Інарый** — рэдк.

**Інгрыд** — які ездзіць конна (герм.)

**Індзіс** — індус (лац.), індзейскі (грэч.)

**Іона** *прар.*, Ёнаш — голуб (яўр.)

**Іосій** — імя аднаго з братоў Госпада (яўр.)

**Іосіф**, Восіп, Юзаф, Язэп — памножаны, няхай Бог памножыць (яўр.)

**Іоў** — які звяртаецца да Бога, каецца (яўр.)

**Іпаліт** — які распрагае коней (грэч.)

**Іпат**, *гл.* Іпацій

**Іпацій**, Іпат, Апат — высокі, найвышэйшы (грэч.)

**Іпярыхій** — які пераўзыходзіць ва ўсім (грэч.)

**Ірадзіён** *ап.*, Радзівон, Радыён — геройскі, ружовы (грэч.)

**Іракламвон**, Іраклямон — Гераклаў (грэч.); Геркулесаў (лац.)

**Іраклій** — прысвечаны Гераклу, слава Геры (грэч.)

**Іраклямон**, *гл.* Іракламвон

**Ірам** — гарадскі (яўр.)

**Ірвін** — сябар дзіка (англ.)

**Ірмос** — спляценне (грэч.); імя ад назвы жанру старажытна-

рускай царкоўнай музыкі (ст.-руск.)

**Ірынарх** — пачынальнік свету, начальнік свету (грэч.)

**Ірыней**, Ірыній — мірны, спакойнае жыццё (грэч.)

**Ірыній**, *гл.* Ірыней

**Ісаак**, *гл.* Ісаакій

**Ісаакій**, Ісаак, Ісак, Ісакей, Ісакій — смех, радасны смех; ён будзе смяяцца, засмяецца (яўр.)

**Ісаій**, *гл.* Ісаія

**Ісаія** *прар.*, Ісаій, Ісай — збавенне Гасподняе, якога Бог падтрымаў (яўр.)

**Ісай**, *гл.* Ісаія

**Ісак**, *гл.* Ісаакій

**Ісакей**, *гл.* Ісаакій

**Ісакій**, *гл.* Ісаакій

**Ісаў** — валасаты, калматы, кудлаты (яўр.)

**Ісаўр** — роўны і ціхі вецер (грэч.); з Ісаўрыі (лац.)

**Ісафат**, *гл.* Іаасаф

**Ісахар** — падзяка, узнагарода (яўр.)

**Ісідар**, Сідар — дар багіні Ісіды, культ якой існаваў у Старажытнай Грэцыі (грэч.)

**Ісіхій** — спакойны, ціхі, мірны (грэч.)

**Іской** — які думае (грэч.)

**Ісмаіл**, *гл.* Ізмаіл

**Ісоп** — рэдк.

**Іспалт** — рэдк.

**Істома** — леў сярод людзей (ст.-грэч.); млявы (ст.-руск.)

**Істукарый** — які ўзначальвае (грэч.)

**Іўвяналій**, Ювяналій — юнацкі (лац.)

**Іўвянцін**, *гл.* Эвенція

**Іулій**, Юлій — пушысты, хвалісты, кучаравы (грэч., лац.)

**Іўліян**, *гл.* Юліян

**Іуст**, *гл.* Юст

**Іўсцін**, Юсцін, Юстын, Усцім, Усцін — Юстаў, які належыць Юсту (лац.)

**Іўсцініян**, Юсцініян — Іўсцінаў, Юстынаў (лац.)

**Іўхар** — выбраны (яўр.); імя аднаго з сыноў цара Давіда

**Іўхірыён** — рэдк. (груз.)

**Іямвліх**, *гл.* Іамвліх

**Іяра́кс** — сокал (грэч.)

**Іярон** — свяшчэнны, пасвячоны (грэч.)

**Іясей** — дар Бога (яўр.); імя бацькі цара Давіда

**Іясон**, *гл.* Іасон

**Іяфай** — Богам вызвалены (яўр.)

# К

**Кадзімім** — рэдк.

**Кадзіс** — ад назвы левіцкага горада (яўр.)

**Кадрат** *ап.* — чатырохкутны, квадратны (лац.)

**Казімір** — той, хто не дае ворагу спакою (слав.)

**Каламан**, Кольман — голуб (англ.); пустэльнік (ірл.)

**Калівіт** — рэдк.

**Калікст** — найлепшы, найпрыгажэйшы (грэч.)

**Калімах** — добры воін (грэч.)
**Калімер** — прыгожы дзень (грэч.)
**Каліна**, Калінік — добры переможца (грэч.)
**Калінік**, *гл.* Каліна
**Каліопій** — цудоўны спявак (грэч.)
**Каліст**, *гл.* Каліcтрацій
**Каліcтрат**, *гл.* Каліcтрацій
**Каліcтрацій**, Каліcтрат, Каліст — спрытны, спрытны воін (грэч.)
**Калогер** — прыгожы стары (грэч.)
**Калумбан** — лагодны, далікатны; голуб, галубіца (лац.)
**Калуф** — які суправаджае, пастух (егіп.)
**Калясанцій** — імя святога — апекуна школьнай моладзі; ад назвы мясцовасці Калясанца (лац.)
**Каміл** — шляхетнага паходжання (лац.)
**Камільян** — які належыць Камілу; юнак са слаўнага роду (лац.)
**Кананіт** — прыхільнік, змагар, апякун (яўр.)
**Канафей** — рэдк.
**Кангар** — зручнае кап'ё + адважны (герм.)
**Кандзід**, Кандзідзій — белы, чысты, бліскучы (лац.)
**Кандзідзій**, *гл.* Кандзід
**Кандрат**, *гл.* Кандрацій
**Кандрацій**, Кандрат — шыракаплечы (грэч.)
**Канізій** — рэдк.
**Канкордзій** — згода, згодны (лац.)
**Канрад**, Конрад — адважны, смелы дарадца (герм.)
**Канстанцін** — цвёрды, стойкі, пастаянны (лац.)
**Канстанцый** — настойлівы, станоўчы, пастаянны (лац.)
**Кантард** — смелы, адважны (ням.); бой + сіла (герм.)
**Кантыдзій** — які спявае (лац.)
**Кантыдзіян** — які належыць Кантыдзію (лац.)
**Канут** — вузел (герм.); імя святога Даніі (лац.)
**Капік** — малпа (арам.)
**Капістран** — рэдк.
**Капітон** — з вялікай галавой (лац.)
**Капразій** — рэдк. (лац.)
**Каранат** — венчаны, каранаваны (лац.)
**Карбініян** — падобны да крумкача; паходзіць з Карбеі (лац.)
**Кардзіян** — сэрца (лац.)
**Карл** — асілак, мужны чалавек (ням.)
**Карм** — ад злучэння *Красная Армия* (рус.)
**Кармель** — рэдк.
**Карнаш** — рэдк.
**Карней**, *гл.* Карнілій
**Карнелій**, Карнель — рог, дзёрн; народжаны на Кіпры (лац.)
**Карнель**, *гл.* Карнелій
**Карніл**, *гл.* Карнілій
**Карніла**, *гл.* Карнілій
**Карнілій**, Карніла, Карніл, Карней — дужы (лац.)
**Карнот**, Карнут, Корнут — сагнуты (лац.)
**Карнут**, *гл.* Карнот
**Карп** *ап.*, Карпей — плод (грэч.)
**Карпафор** — ураджайны; той, хто прыносіць плады (грэч.)
**Карпей**, *гл.* Карп

**Картэрый**, Карцерый — цярплівы, мужны, моцны (грэч.)
**Карцерый**, *гл.* Картэрый
**Карыён** — найміт, маларослы салдат; з краіны Карыі (грэч.)
**Карыў** — імя жраца фрыгійскай багіні Кібелы (грэч.)
**Касіян**, Касьян — пусты, парожні, бедны (лац.)
**Касконій** — рэдк. (лац.)
**Касма**, Кузьма — упрыгожанне (грэч.)
**Каспер** — вартаўнік скарбаў (серб., польск.)
**Кастар** — бліскучы, выдатны начальнік (грэч., лац.)
**Касторый** — бобр (грэч.)
**Кастрыкій**, Кастрыхій — лагерны, узброены, умацаваны (лац.)
**Кастрыкіян** — які належыць Кастрыкію (лац.)
**Кастрыхій**, *гл.* Кастрыкій
**Кастул** — узброены, чысты, бязгрэшны (лац.)
**Касьян**, *гл.* Касіян
**Катальд** — рэдк.
**Катулін** — шчаня (лац.)
**Катун** — магчыма, дзіця (грэч.)
**Катэрый**, Кацерый — разбуральны (грэч.)
**Каўсаім** — рэдк.
**Каўсяіл** — рэдк.
**Кацерый**, *гл.* Катэрый
**Каятан** — які паходзіць з горада Каста (паблізу Неапаля) (лац.)
**Кварт**, *гл.* Куарт
**Квінт**, Коінт — пяты (лац.)
**Квінтыліян**, *гл.* Квінціліян
**Квінціліян**, Квінтыліян, Кінтыліян — які нарадзіўся ў ліпені (у старажытнасці ліпень быў пятым месяцам у годзе) (лац.)
**Квінцін** — з сям'і роду, прозвішча якога паходзіць ад лічэбніка *пяты* (лац.)
**Квірын** — імя ад назвы рымскіх жыхароў (лац.)
**Келсій**, Кельсій, Цэльсій — высокі, узвышаны (лац.)
**Кельсій**, *гл.* Келсій
**Келясцін**, Цэлясцін — блакітны, нябесны, які з'явіўся з неба (лац.)
**Кендзявей** — імя правіцеля прыморскай Сірыі, які жыў у час іўдзейскага першасвятара Сімана (сір.)
**Кенсарын** — які належыць знатаку, даследчыку; строгі (лац.)
**Кенцінар** — імя ад назвы старой адзінкі вагі на Русі (грэч., слав.)
**Кесар** *ап.*, Кесарый — цар, царскі, іссечаны (лац.)
**Кесарый**, *гл.* Кесар
**Кіён** — акіян (лац.); калона, помнік (грэч.)
**Кіліян** — маленькі воін (кельцк.)
**Кім** — а) скарочаная форма імені *Іакім* (яўр.); б) імя савецкага часу, утворанае ад спалучэння пачатковых літар назвы *Камуністычны інтэрнацыянал моладзі* (рус.)
**Кіндзей** — рухавы, які рызыкуе, ідзе ў бой (грэч.)
**Кінтыліян**, *гл.* Квінціліян
**Кіпрыян**, Купрыян, Купрэй — спелы плод (араб.)
**Кір**, *гл.* Кірэй

**Кірыён** — жрэц, дэпутат (лац.)
**Кірык** — веснік, прапаведнік (грэч.)
**Кірыл**, *гл.* Кірыла
**Кірыла**, Кірыл — сонца (перс.); які мае сілу (грэч.)
**Кірын** — ад назвы ўзгорка ў Рыме (лац.)
**Кірыяк**, *гл.* Кірэй
**Кірыян**, *гл.* Кірэй
**Кірэй**, Кірыяк, Кірыян, Кір — гаспадар (грэч.); сонца (яўр.)
**Кіфа** *ап.* — камень, скала (арам.)
**Кларус** — чысты, светлы, ясны (лац.)
**Кларэнцій** — бліскучы (лац.)
**Клаўдзей**, *гл.* Клаўдзій
**Клаўдзій**, Клаўдзей — кульгавы (лац.); рымскае родавае імя
**Клаўдзіян** — Клаўдзіеў, кульгавы (лац.)
**Клеадзім** — рэдк.
**Клеафас** — народжаны ад слаўнага шляхетнага бацькі (грэч.)
**Клеменс**, *гл.* Клемянцін
**Клемянцін**, Клеменс — спакойны, ціхі, ласкавы (лац.)
**Клім**, *гл.* Клімент
**Клімент** *ап.*, Кліменцій, Клім — міласцівы (лац.)
**Кліменцій**, *гл.* Клімент
**Клод** — кульгавы (лац.); французскі варыянт імені *Клаўдзій*
**Кляон**, *гл.* Кляонік
**Кляонік**, Кляон — слаўны пераможца (грэч.)
**Кляопа** *ап.* — усяслаўны (яўр.)
**Коінт**, *гл.* Квінт
**Колпас** — ад назвы часткі хітона, спушчанага над таліяй пры падпяразванні (у жаночым адзенні) у VII—II стст. да н. э. (яўр.)
**Кольман**, *гл.* Каламан
**Конан** — які працуе, служыць, спяшаецца (грэч.)
**Конрад**, *гл.* Канрад
**Копрый** — які творыць (грэч.)
**Корнут**, *гл.* Карнот
**Кранід**, Кроній — сын Кронаса, бацькі Зеўса (грэч.)
**Кроній**, *гл.* Кранід
**Крысан** — рэдк.
**Крыскент** *ап.*, Крыскенцій — які расце (лац.)
**Крыскенцій**, *гл.* Крыскент
**Крыскенціян** — Крыскенціеў; які расце (лац.)
**Крысп** *ап.*, Крыспін — кучаравы, які мае кучаравыя валасы (лац.)
**Крыспін**, *гл.* Крысп
**Крыспініян** — Крыспінаў; кучаравы (лац.)
**Крысцін** — які належыць Хрысту (лац.)
**Ксавер**, *гл.* Ксаверый
**Ксаверый**, Ксавер — ад назвы замка ў Іспаніі, адкуль паходзіць Святы Францыск
**Ксанф**, *гл.* Ксанфій
**Ксанфій**, Ксанф — светла-ружовы, рыжы (грэч.)
**Ксенадох** — ад назвы прытулку для бедных і хворых у Візантыі (грэч.)
**Ксенафонт** — які гаворыць на замежных мовах (грэч.)
**Ксінон** — чужаземец, чужы (грэч.)
**Куарт** *ап.*, Кварт — чацвёрты (лац.)

**Куберт**, *гл.* Кутберт

**Кузьма**, *гл.* Касма

**Кукша** — назва птушкі з сямейства вераб'іных (слав.)

**Куніберт** — дзейны, адважны (герм.)

**Купрыян**, *гл.* Кіпрыян

**Купрэй**, *гл.* Кіпрыян

**Кутберт**, Куберт — вядомы, знакаміты, смелы чалавек (герм.)

**Кутоній** — галоўны (лац.)

**Куфій** — лёгкі, лёгкаўзброены воін (грэч.)

**Кшэсімір** — які будзіць, уваскрашае (слав.)

**Кшэсіслаў** — які ўваскрашае славу (слав.)

# Л

**Лаадзікій** — які разглядае скаргу, народны суддзя (грэч.)

**Лаван** — белы (яўр.)

**Лавер** — закаханы (герм.)

**Лагафет** — які выдае пастанову, загад (грэч., лац.)

**Ладзіслаў**, *гл.* Уладзіслаў

**Лазар** — дапамога Божая (яўр.)

**Лазарыян** — які належыць Лазару (яўр.)

**Лаліян** — Лоліеў (грэч.)

**Лампад** — светач, які прасвятляе (грэч.)

**Ланфранк** — вольны ў краі (ням.)

**Ларгій** — шчодры (лац.); багаты (грэч.)

**Ларыён**, *гл.* Іларыён

**Латан** — утойванне, скрыванне (яўр.)

**Лаўр** — перамога, урачыстасць; лаўровае дрэва, лаўровы вянок (лац.)

**Лаўрын**, Лаўрэн, Лаўрэнцій — лаўровы; з горада Лаўрэнта (лац.)

**Лаўрэн**, *гл.* Лаўрын

**Лаўрэнцій**, *гл.* Лаўрын

**Лафідор** — рэдк.

**Лахіс** — узгорак, узвышша; ад назвы хананейскага горада (яўр.)

**Леавігільд** — пільны леў, які не спіць (герм.)

**Леакадзій** — які клапоціцца пра людзей (грэч.)

**Леанард** — моц, сіла (лац., ням.)

**Леандар** — чалавек мужны (грэч.)

**Леанід** — падобны да льва (грэч.)

**Леанор** — Бог з'яўляецца маім святлом (араб.)

**Леапольд** — адважны, смелы (герм.)

**Легер** — вядомы воін, кідальнік кап'я (ням.)

**Леў**, *гл.* Лявон

**Леўкій**, Ляўкій — белы, светлы, яркі (грэч.)

**Лех** — магчыма, ад дзеяслова *хваліць* ці *ліслівіць* (слав.); імя праайца палякаў — брата Руса і Чэха (польск.)

**Лехаслаў** — Лех + слава (слав.)

**Ліберт**, *гл.* Лібярат

**Лібяраль** — добразычлівы, адкрыты, шляхетны (лац.)

**Лібярат**, Ліберт — вызвалены (лац.)

**Ліван** — белы; ад назвы ланцуга гор паміж Іўдзеяй і Сірыяй; ад назвы пахучага рэчыва (яўр.)

**Ліверый** — вольны, свабодны, незалежны (лац.)

**Лікарыён** — воўчы, ваўчаня (грэч.)

**Лімней**, *гл.* Лімній

**Лімній**, Лімней — возера, азёрны, балотны (грэч.)

**Лін** *ап.* — цудоўная кветка, сумная песня, юнак; імя міфічнага героя, музыканта і спевака (грэч.)

**Лісім**, *гл.* Лісімах

**Лісімах**, Лісім — які спыняе бітву (грэч.)

**Логвін**, Логін, Лонгін — доўгі (лац.)

**Логін**, *гл.* Логвін

**Лолій** — трава куколь (грэч.); лятучая рыба (лац.)

**Лонгін**, *гл.* Логвін

**Лот** — покрыва; імя пляменніка Аўраама, які быў адзіным памочнікам, акрамя жонкі, пры перасяленні яўрэяў у Ханаан (яўр.)

**Луарсаб** — імя старажытнагрузінскага цара (груз.)

**Лука** *ап.* — які нарадзіўся пры ўзыходзе сонца; з Луканіі (лац.)

**Лукій** *ап.* — бліскучы, светлы; які свеціць (лац.)

**Лукіліян**, *гл.* Лукіян

**Лукін** — які свеціць (лац.)

**Лукіян**, Лук'ян, Лукіліян — святло, светлы; які ззяе (лац.)

**Лук'ян**, *гл.* Лукіян

**Луп**, Лупан — воўк (лац.)

**Лупан**, *гл.* Луп

**Любамір** — каханы, жаданы (слав.)

**Любапаліт** — рэдк.

**Любарад** — любімы, рады (слав.)

**Любаслаў** — любімы + слава (слав.)

**Любім** — любімы (слав.)

**Людамір** — людзі + спакой (слав.)

**Людан** — які прызначаны Люду — аднаму з гальскіх багоў (кельцк.)

**Людаслаў** — людзі + слава (слав.)

**Людвіг** — вядомы, славуты, слаўны ў баі (герм.)

**Людвін** — сябар людзей (герм.)

**Людгард** — абаронца, апякун (герм.)

**Людольф**, *гл.* Рудольф

**Люпус** — воўк (лац.)

**Лютагнеў** — суровы, сур'ёзны + + гнеў (слав.)

**Лютамір** — круты, сур'ёзны + + спакой (слав.)

**Лютаслаў** — круты, суровы + + слава (слав.)

**Люцыд** — празрысты (лац.)

**Люцыян** — святло, светлы (лац.)

**Ляандар**, *гл.* Ляандр

**Ляандр**, Ляандар — леў (лац.)

**Лявей**, Лявій — які суправаджае, прыслужвае (яўр.)

**Лявій**, *гл.* Лявей

**Лявон**, Ляонт, Леў — леў (грэч.)

**Лявонцій** — ільвіны — (грэч.)

**Лямберт** — са светлай краіны (ст.-герм.)

**Ляонт** — *гл.* Лявон

**Ляслаў** — слаўны заступнік, абаронца (польск.)

**Ляўкій**, *гл.* Леўкій

# М

**Маглорый** — сын хвалы (кельцк.)
**Магн**, Магнус — вялікі (лац.)
**Магнус**, *гл.* Магн
**Мадэран** — сучасны (франц.)
**Мадэст** — сціплы, ветлівы, памяркоўны (лац.)
**Маел** — князь (кельцк., ст.-ірл.)
**Маёль** — большы (лац.)
**Маісей** *прар.*, Майсей — узяты з вады (егіп., яўр.)
**Майжэш** — сын, дзіця (егіп.); выратаваны з вады (яўр.)
**Майнард**, Мінард — моцны, вынослівы (ням.)
**Майсей**, *гл.* Маісей
**Макавей** *мак.* — молат, малаток (арам.); імя ад назвы яўрэйскага племені (яўр.)
**Макар**, *гл.* Макарый
**Макарый**, Макар — шчаслівы (грэч.)
**Македон**, *гл.* Македоній
**Македоній**, Македон — з Македоніі, македонец (грэч.)
**Макей**, Макій — насмешнік, які высмейвае (грэч.)
**Макій**, *гл.* Макей
**Макіян** — які належыць Макею (Макію) (грэч.)
**Макровій** — доўгажыхар (грэч.)
**Максім**, Максіян, Маўсіма — найвялікшы, самы вялікі (лац.)
**Максіміліян**, Максімільян, Максімілян — вялікі, з роду Эміліяў (лац.)
**Максімільян**, *гл.* Максіміліян
**Максімілян**, *гл.* Максіміліян
**Максіміян** — Максімаў (лац.)
**Максіян**, *гл.* Максім
**Маламір** — малы + спакой (слав.)
**Маланій**, *гл.* Меланій
**Малафей**, *гл.* Малахія
**Малах**, *гл.* Малахія
**Малахій**, *гл.* Малахія
**Малахія** *прар.*, Малахій, Малах, Малафей — пасланец Божы (яўр.)
**Малх** — цар (яўр.)
**Мамант**, Мамон — маці, карміцель (грэч., лац.)
**Мамерт** — рэдк.
**Мамій** — мамін, бабулін (грэч.); грудны (лац.)
**Мамон**, *гл.* Мамант
**Манаіл** — суцяшальнік (яўр.)
**Манон** — добры, шляхетны, высакародны (ірл.)
**Мансвет** — рэдк.
**Мануіл**, Мануэль — вызначэнне Божае, з намі Бог (яўр.)
**Мануэль**, *гл.* Мануіл
**Манфрэд** — чалавек, які ахоўвае спакой (герм.)
**Мар**, Марэй — рука (грэч.)
**Марат** — імя ад прозвішча рэвалюцыянера-якабінца Жана Поля Марата (1743—1793)
**Мардар**, *гл.* Мардарый
**Мардарый**, Мардар — з Мардара — мясцовасці ў Арменіі (грэч.)
**Мардоній** — ад назвы *марды* — племені ў Паўночнай Арменіі (грэч.); мардарыйскі (лац.)
**Марк** *ап.*, Марка — сухі, які вяне (лац.); малаток (грэч.)
**Марка**, *гл.* Марк

**Маркел** *мак.*, Маркелін, Марцэлій, Марцэль — ваяўнічы (лац.)

**Маркелін**, *гл.* Маркел

**Маркіян** — Маркаў (лац.)

**Маркен** — ад частак слоў *Маркс* + *Ленін* (рус.)

**Марлен** — ад частак слоў *Маркс* + + *Ленін*; гэта імя паводле паходжання нельга атаясамліваць з жаночым іменем *Марлена* (рус.)

**Марон** — рымскае радавое імя (лац.); імя выхавальніка юнага Вакха (грэч.)

**Марсалій** — ваяўнічы, Марсаў (лац.)

**Мартын**, *гл.* Марцалій

**Мартэн** — імя савецкага часу са значэннем *мартэнаўская печ*; імя французскага металурга *П'ера Мартэна* (франц.)

**Маруф** — знакаміты (сір.); вядомы (араб.); безвалосы (яўр.)

**Мархольд** — рэдк.

**Марцалій**, Марцьян, Марцін, Марціян, Марцыял, Мартын — які належыць богу Марсу; ваяўнічы (лац.)

**Марцалін** — які належыць да рымскага роду Марцэлі (лац.)

**Марцін**, *гл.* Марцалій

**Марцініян** — ваяўнічы, Марцінаў (лац.)

**Марцірый** — сведка, мучанік (грэч.)

**Марціян**, *гл.* Марцалій

**Марцыял**, *гл.* Марцалій

**Марцэлій**, *гл.* Маркел

**Марцэль**, *гл.* Маркел

**Марцьян**, *гл.* Марцалій

**Марцям'ян** — народжаны ў сакавіку (лац.)

**Марын**, Марыян, Мар'ян — мора, марскі, чалавек мора (лац.)

**Марыян**, *гл.* Марын

**Марыяў** — рэдк.

**Марэй**, *гл.* Мар

**Марэлій** — рэдк.

**Мар'ян**, *гл.* Марын

**Матрыкс** — рэдк.

**Матфан** — дар, падарунак (яўр.)

**Матфей** *ап.*, Мацвей — Божы дар (грэч.); Божы чалавек (ст.-грэч.)

**Матфій** *ап.*, Мацвій — дараваны Богам (яўр.)

**Матэвуш** — дар Яхве (Бога) (ст.-яўр.)

**Матэрн** — мацярынскі (лац.)

**Маўр**, *гл.* Маўрыкій

**Маўродзій** — песня маўра (маўры — у старажытнасці і сярэднія вякі еўрапейская назва карэннага насельніцтва Паўночнай Афрыкі, акрамя Егіпта, і арабаў)

**Маўрыкій**, Маўрыцій, Маўр — цёмны, чорны (грэч.)

**Маўрылій** — велікадушны (кельцк.); любімы маўр (лац.)

**Маўрын** — той, хто паходзіць з Маўрытаніі (лац.)

**Маўрыцій**, *гл.* Маўрыкій

**Маўсіма** — вытворнае ад імені *Максім* (лац.)

**Мацвей**, *гл.* Матфей

**Мацвій**, *гл.* Матфій

**Мевен** — той, хто поіць мужчын (кельцк.)

**Медасей** — рэдк.

**Медзімін**, Мядзімн — мера сыпкіх рэчываў, хлебная мера (грэч.)

**Меланій**, Маланій — чорны, цёмны (грэч.)
**Меласіп** — які клапоціцца пра каня (грэч.)
**Мелісен** — пчала, пчаліны (грэч.)
**Мелітон** — мядовы (грэч.)
**Мелхісядэк** — цар праўды (яўр.)
**Мельхіёр** — які з'яўляецца маім святлом, Бог — мая святасць (яўр.)
**Мельхіяд** — рэдк.
**Мелянцей**, *гл.* Мялецій
**Меляўсіп** — які клапоціцца аб кані (грэч.)
**Мемнан**, Мямнон — памятлівы (грэч.)
**Менас** — магчыма, ад імені *Мені* — аднаго з вавілонскіх багоў, якія, як думалі тады, вызначалі лёс чалавека (грэч.)
**Менінг** — бясстрашны (грэч.)
**Мерцій** — заслужаны, варты (лац.)
**Месрап** — рэдк.
**Мечыслаў** — які будзе мець славу (слав.)
**Мігдоній** — магчыма, жыхар Фрыгіі (грэч.)
**Мікалай** — пераможца народа (грэч.)
**Мікіта**, *гл.* Мікіцій
**Мікіцій**, Мікіта — пераможца (грэч.)
**Мікней** — уласнасць Іеговы (яўр.)
**Мікула** — перамагаць, які перамагае (грэч.)
**Мілаван** — мілаваць, мілаваны (лац., слав.)
**Мілан**, Мілій, Міль — яблычны (грэч.)
**Міласлаў** — мілы, любы + слава (лац.)
**Мілаш** — скарочаная форма ад імені *Міласлаў*
**Мілій**, *гл.* Мілан
**Міль**, *гл.* Мілан
**Мімнянос** — рэдк. (груз.)
**Міна**, Мінай, Міней, Мінявон — месяц, месяцавы (грэч.)
**Мінай**, *гл.* Міна
**Мінард**, *гл.* Майнард
**Міней**, *гл.* Міна
**Мініямін** — шчаслівы (яўр.)
**Мініят** — фарбаваны (лац.)
**Мінсіфей** — які памятае пра Бога (грэч.)
**Мінявон**, *гл.* Міна
**Мір** — мір, спакой, цішыня (рус.)
**Міракс** — юнак (грэч.)
**Міран**, Мірон — які вытачае міра — пахучы царкоўны ялей (грэч.)
**Мiраслаў** — спакой + слава (слав.)
**Міроклій** — міра + слава, хвала (грэч.)
**Мірон**, *гл.* Міран
**Місаіл** — Богам умацаваны, выпрашаны ў Бога, Богу належыць (яўр.)
**Міслаў** — думка + слава (слав.)
**Мітрадор** — маці + дар (грэч.)
**Мітрафан** — маці яўлены (грэч.)
**Міхаіл** *арх.* — хто як Бог, роўны Богу (яўр.)
**Міхей** *прар.* — падобны да Бога (яўр.)
**Міцір** — рэдк.
**Міян** — які належыць маці, карміцельцы (грэч.)
**Мокій** — насмешнік (грэч.)
**Мсцібор** — які змагаецца, помсціць (слав.)

**Мсціслаў** — слаўны мсцівец (слав.)

**Муірадах** — рэдк.

**Мука**, Мукій — той, хто заікаецца, заіка (слав.)

**Мукій**, *гл.* Мука

**Мурын** — чорны (егіп.); сцяна (лац.); эфіаплянін (грэч.)

**Мусікій** — рэдк.

**Мыслібор** — думка+змагацца (слав.)

**Мэлк** — рэдк.

**Мядарт** — моцны, стойкі, адважны (лац., ст.-герм.)

**Мядзімн**, *гл.* Медзімін

**Мядосій** — рэдк.

**Мялас** — чорны (грэч.)

**Мяленцій**, *гл.* Мялецій

**Мялецій**, Мяленцій, Мелянцей — клапатлівы апякун, старанны (грэч.)

**Мямнон**, *гл.* Мемнан

**Мянандр** — дужы мужчына (грэч.)

**Мяней**, *гл.* Мянея

**Мянея**, Мяней — моцны, пастаянны (грэч.)

**Мянігн** — бясстрашны (грэч.)

**Мяркул**, *гл.* Мяркурый

**Мяркур**, *гл.* Мяркурый

**Мяркурый**, Мяркул, Мяркур — купец; імя бога, які лічыўся апекуном купцоў, падарожнікаў, пастухоў, прамоўцаў (лац.)

**Мятодзій**, *гл.* Мяфодзій

**Мятранс** — рэдк.

**Мяфодзій**, Мятодзій — які ўпарадкоўвае, ведае методыку (грэч.)

# Н

**Наам**, Нааман — радасць, міласць Божая (яўр.)

**Нааман**, *гл.* Наам

**Набор** — той, хто моліцца (фінік.)

**Навамір** — ад спалучэння слоў *новы* + *мір* (рус.)

**Навум** *прар.* — суцяшэнне (яўр.)

**Назар**, *гл.* Назарый

**Назарый**, Назар — прысвечаны Богу (яўр.)

**Назарэй** — аддзяляць, адлучаць (яўр.)

**Напаляон** — які паходзіць з Неапаля (лац.)

**Нарзет** — рэдк.

**Наркіс** *ап.*, Нарцыс — цудоўны юнак, ператвораны багамі ў кветку, нарцыс (грэч.)

**Нарцыс**, *гл.* Наркіс

**Нат**, *гл.* Натан

**Наталій** — родны, народжаны (лац.)

**Натан**, Нат — падараваны (яўр.)

**Наўкрацій** — які перамагае на моры (грэч.)

**Нафан**, *гл.* Нафанаіл

**Нафанаіл**, Нафан — дадзены Богам, падараваны (яўр.)

**Неафіт** — новазвернуты, новаасаджаны (грэч.)

**Нерангіёс** — рэдк. (груз.)

**Нерый**, Нярэй — ад імені Венеры — багіні любві і прыгажосці (грэч.)

**Нестар**, *гл.* Несцер

**Несцер**, Нестар — які вярнуўся дадому (грэч.)

**Неўфалім**, *гл.* Нефалім

**Нефалім**, Неўфалім — барацьба з дапамогай малітвы, спрэчка (яўр.)

**Неямія** — Бог суцяшае (яўр.)

**Нікадзім** — пераможца народа (грэч.); бязвінная кроў (яўр.)

**Нікамед** — які думае пра перамогу (грэч.)

**Нікан**, Нікандр — пераможца, чалавек перамогі (грэч.)

**Нікандр**, *гл.* Нікан

**Ніканор** *ап.* — той, хто сузірае перамогу (грэч.)

**Нікастрат** — воін-пераможца (грэч.)

**Нікель** — падземны дух (ням.)

**Нікіфар**, Нічыпар — перамаганосец (грэч.)

**Ніктапаліён** — які належыць гораду (грэч.)

**Ніл** — ад назвы ракі *Ніл* (грэч.); чорны (інд.)

**Нінан** — сяброўскі (араб.); Бог міласэрны (яўр.)

**Німіян** — імя першага хрысціянскага епіскапа ў Шатландыі (каля 360 — 432 гг.)

**Нірс**, *гл.* Нірса

**Нірса**, Нірс — вільготны (грэч.)

**Ніт** — бліскучы, светлы (лац.)

**Ніфант**, *гл.* Ніфанцій

**Ніфанцій**, Ніфант — цвярозы (грэч.)

**Нічыпар**, *гл.* Нікіфар

**Ноберт**, *гл.* Норберт

**Ной** — спакой, заспакаенне; імя апошняга з дапатопных патрыярхаў па прамой лініі ад Адама (яўр.)

**Нон** — які павялічваецца, распаўсюджваецца (яўр.)

**Нонас**, Нонус — чысты, Богу пасвячоны (егіп.)

**Нонус**, *гл.* Нонас

**Норберт**, Ноберт — слаўны муж з поўначы (ням.)

**Нянiй** — новы (грэч.)

**Нявон** — малады, юны, які плавае (грэч.)

**Няктар**, *гл.* Няктарый

**Няктарый**, Няктар — пітво багоў (грэч.)

**Нямезій** — прызначэнне належнага (грэч.)

**Нямір** — не + спакой (слав.)

**Нямнон** — народны (ст.-грэч.); які памятае (грэч.)

**Нярэй**, *гл.* Нерый

**Няфёд** — упарадкаваны (грэч.)

**Нячай** — нечаканы, неспадзяваны (слав.)

# О

**Одран** — моцны, дужы (кельцк.)

**Олаф** — справядлівы, праведны (ням. са сканд.)

**Ор** — муж, гара (грэч.); святло (лац.)

**Освальд** — абаронца дому (герм.)

**Оскар**, *гл.* Анзгар

**Отан** — багацце, уласнасць (ст.-герм.)

# П

**Павел** *ап.*, Паўланцій, Паўлін — малы, маленькі, невялікі (лац.)

**Пад'ём** — імя ад дзеяслова *падняць* (рус.)

**Паздзей** — позні (ст.-слав.)

**Паісій** — дзіцячы, усім роўны (грэч.)

**Пактовій** — захавальнік жыцця, які ўмацоўвае (грэч.)

**Паладзій** — апора, ахова (грэч.)

**Палалій** — рэдк.

**Паламон** — дзейны, актыўны (грэч.)

**Паліект**, *гл.* Паліеўкт

**Паліен** — шматхвальны (грэч.)

**Паліеўкт**, Паліект, Палуект — жаданы, доўгачаканы (грэч.)

**Палікарп**, *гл.* Палікарпій

**Палікарпій**, Палікарп — мнагалюдны, ураджайны на плады (грэч.)

**Паліхроній** — шматгадовы (грэч.)

**Палувій** — які мае шмат сродкаў для жыцця (грэч.)

**Палуект**, *гл.* Паліеўкт

**Памва** — пастух усіх (грэч.)

**Памвон** — які да ўсіх усклікае, шматгучны (грэч.)

**Пампей**, Помпій — правадыр, удзельнік урачыстага шэсця (грэч.)

**Пампій** — выдатны ва ўсім (грэч.)

**Памфалон** — з усіх родаў, разнародны (грэч.)

**Памфамір** — усяго пазбаўлены (грэч.)

**Памфіл**, Панфіл — агульны сябар, якога ўсе любяць, паважаюць (грэч.)

**Памфіліён** — Памфілаў (грэч.)

**Пангал** — які пераліваецца цераз край, сімвалізуе матэрыяльны дабрабыт (тамільск.)

**Панімон** — рэдк.

**Панкрат**, *гл.* Панкрацій

**Панкрацій**, Панкрат — усемагутны, уседзяржаўны (грэч.)

**Пансофій** — усямудры, наймудрэйшы (грэч.)

**Панталеян**, Панталяён — міласцівы да ўсіх (грэч.)

**Панталяён**, *гл.* Панталеян

**Пантыян** — мора (грэч., лац.)

**Панфіл**, *гл.* Памфіл

**Панхарый** — для ўсіх мілы (грэч.)

**Панцей**, *гл.* Панцеляіман

**Панцелімон**, *гл.* Панцеляіман

**Панцеляіман**, Панцеляймон, Панцелімон, Панцей, Панцялей — усяміласцівы (грэч.)

**Панцеляймон**, *гл.* Панцеляіман

**Панцялей**, *гл.* Панцеляіман

**Пап**, *гл.* Папій

**Папій**, Пап — бацька, дзед (лац.)

**Папіла** — бацька (грэч.)

**Папініян** — бацькаў (лац.)

**Паплій**, Поплій — агульнанародны (лац.)

**Параклiт** — рэдк.

**Парамон** — цвёрды, трывалы, пастаянны (грэч.)

**Пард** — барс, рысь (грэч.)

**Пармен** *ап.*, Парменій, Пармон — трывалы, надзейны, які стойка трымаецца (грэч.)

**Парменій**, *гл.* Пармен

**Пармон**, *гл.* Пармен

**Парод** — дарога, шлях, выхад, выйсце (грэч.)

**Парфен**, *гл.* Парфеній

**Парфеній**, Парфен, Парфён — чысты, нявінны, ад дзевы (грэч.)

**Парфён**, *гл.* Парфеній

**Парфір**, *гл.* Парфірый

**Парфірый**, Парфір — барвовы, пурпуровы, апрануты ў пурпур (грэч.)

**Парціян** — прыняты ў род Порціяў (лац.)

**Парыгорый** — які пераконвае, суцяшае (грэч.)

**Парызій** — з племені парызіяў (кельцк.)

**Пасарыён** — з моцных людзей (грэч.)

**Пасідзій** — які валодае чымсьці (лац.)

**Пасій**, Пасікрат — уладар усіх (грэч.)

**Пасікрат**, *гл.* Пасій

**Патамій** — які нешта робіць, які хоча нешта рабіць (грэч.)

**Патап**, *гл.* Патапій

**Патапій**, Патап — які топча працу нагамі (грэч.)

**Патарый** — з прыморскага горада Патары ў Малой Азіі, які наведаў апостал Павел (лац.)

**Патрокл** — слава бацькі (грэч.)

**Патроў** *ап.* — паслядоўнік бацькі (грэч.)

**Патрык**, *гл.* Патрыкій

**Патрыкей**, *гл.* Патрыкій

**Патрыкій**, Патрыкей, Патрык — шляхетнага паходжання, патрыцый, сенатарскі сын (лац.)

**Патуль** — рэдк.

**Патэнціян** — сіла, магчымасць, здольнасць (лац., польск.)

**Патэрн** — бацькоўскі (лац.)

**Паўланцій**, *гл.* Павел

**Паўлін**, *гл.* Павел

**Паўсакій**, Паўсікакій — які спыняе зло (грэч.)

**Паўсікакій**, *гл.* Паўсакій

**Паўсіліп** — які сунімае журбу (грэч.)

**Пафнуцій** — які належыць Богу (егіп.)

**Пахом**, *гл.* Пахомій

**Пахомій**, Пахом — шырокі ў плячах (грэч.)

**Паціенс** — той, хто пакутуе (лац.)

**Паціт** — які атрымаў штонебудзь, завалодаў (лац.)

**Пацыфік** — той, хто прыносіць мір (лац.)

**Пацярмуфій** — слава бацькі (лац.)

**Пелагій** — марскі, які льецца (грэч.)

**Пелій** — бягун; гліняны (грэч.)

**Перагрын** — падарожны (лац.)

**Перасвет** — светлы, вельмі светлы (ст.-руск.)

**Пергій** — з горада Пергіі ў Малой Азіі, які наведаў апостал Павел з Варнавам (грэч.)

**Перый** — пасвячоны Перыдому, г. зн. музам, ахвяраваны музам (грэч.)

**Пётр** *ап.* — камень, скала, апора (грэч.)

**Піа**, Пій, Пiёр, Піус — адданы Богу, набожны (лац.)

**Півоній** — багаты, поўны (грэч.)

**Пігасій** — з якога струменіцца вада (грэч.)

**Піёр**, *гл.* Піа

**Пій**, *гл.* Піа

**Пілат** — узброены кап'ём (лац., іт.)
**Піліп**, *гл.* Філіп
**Пімен** — пастар (грэч.)
**Піна** — пярліна, перламутравая ракавіна (грэч.)
**Пір** — вогненна-чырвоны, рыжы (грэч.)
**Пірмін** — квітнеючы славай (кельцк.)
**Піст** — верны (грэч.)
**Піус**, *гл.* Піа
**Піцірун**, *гл.* Піцірым
**Піцірым**, Піцірун — носьбіт ліку дзевяць (грэч., лац.)
**Піят**, *гл.* Піятон
**Піятон**, Піят — ачысціць, улагодзіць (лац.)
**Платон** — шыракаплечы, шырокі (грэч.)
**Плацід** — лагодны, спакойны, ласкавы (лац.)
**Плутарх** — багацце + уладар (грэч.)
**Помпій**, *гл.* Пампей
**Понцій** — марскі (лац.)
**Поплій**, *гл.* Паплій
**Пракес**, Прокес — поспех, хада, працэс (лац.)
**Пракоп**, *гл.* Пракофій
**Пракопій**, *гл.* Пракофій
**Пракофій**, Пракопій, Пракоп — які пераганяе, апярэджвае, паспявае (грэч.)
**Пракул**, Прокл, Прокул — далёкі (лац.); той, чыя слава ідзе спераду ад яго (грэч.)
**Прасдацім**, *гл.* Прасдок
**Прасдок**, Прасдацім — чаканы, жаданы, якога чакаюць (грэч.)
**Праспер** — шчаслівы, прыхільны (лац.)
**Пратаген** — які народжаны першым (грэч.)
**Пратальён**, *гл.* Праталяон
**Праталяон**, Пратальён — першы, старэйшы леў (грэч.)
**Пратас**, *гл.* Пратасій
**Пратасій**, Пратас — які стаіць у першым шэрагу, перадавы (грэч.)
**Пратэрый**, Прот — які папярэджвае (грэч.)
**Провій**, Проў — сумленны, добры (лац.)
**Прокес**, *гл.* Пракес
**Прокл**, *гл.* Пракул
**Прокул**, *гл.* Пракул
**Прот**, *гл.* Пратэрый
**Проў**, *гл.* Провій
**Прохар** *ап.* — начальнік, кіраўнік хору (грэч.)
**Прудэнцій** — асцярожны, дасведчаны, удумлівы (лац.)
**Прылідзіян** — які дае, робіць (лац.)
**Прынкіпс** — першы, галоўны (лац.)
**Прыск** — стары (лац.)
**Псой** — паясніца, прыдзірлівы (грэч.)
**Пталамей** — ваяўнічы; імя шаснаццаці вядомых егіпецкіх цароў і некаторых дзеячаў Палесціны ў дахрысціянскі перыяд (лац.)
**Публій**, Публія, Пуплій — народны, агульнанародны, публічны (лац.)
**Публія**, *гл.* Публій
**Пуд** *ап.* — сарамлівы (лац.)
**Пудзент** — рэдк. (лац.)
**Пуплій**, *гл.* Публій
**Пурпур** — барвовы (грэч.)

**Пшыбаслаў** — прыбыць + слава (слав.)
**Пшэміл** — перад + мілы (слав.)
**Пшэмыслаў** — перад + думка (слав.)
**Пшэцлаў** — перад + слава (слав.)
**Пявон** — лекар, урач (грэч.)
**Пяргам** — рэдк.
**Пярфіл**, *гл.* Пярфілій
**Пярфілій**, Пярфіл — апрануты ў багру (грэч.)
**Пятроній** — са скалістага месца (лац.)

# Р

**Рабан** — крумкач (ням.)
**Равул**, *гл.* Равула
**Равула**, Равул — сварлівы (яўр.); крыкун (лац.)
**Рагвалод** — які карыстаецца аўтарытэтам сярод таварышаў (ст.-герм.)
**Рагер** — рэдк.
**Рагноберт** — цудоўная парада (герм.)
**Рагуіл**, Рагул — пазнаваць Бога (ст.-яўр.)
**Рагул**, *гл.* Рагуіл
**Радаміл** — рады, любы (слав.)
**Радамір** — рады, апекавацца + + спакой (слав.)
**Радапіян** — ружовы; з мясціны Радопа (горны ланцуг у Фракіі) (грэч.)
**Радарык** — поўны хвалы (ням.)
**Радацех** — рады (слав.)
**Радбод** — рада + адважны (герм.)
**Радзівон**, *гл.* Ірадзіён
**Радзім** — скарочаная форма імені *Радзімір* (слав.)
**Радзімір** — рады, апекавацца + + спакой (слав.)
**Радзіслаў** — рады, апекавацца + + слава (слав.)
**Радост** — радасць (слав.)
**Радульф** — парада + воўк (герм.)
**Радыён**, *гл.* Ірадзіён
**Радый** — прамень (лац.)
**Раждзен** — святло веры (груз.)
**Разван** — рэдк.
**Разумнік** — мудры, разумны (слав.); славянскі пераклад імені *Сінезій*
**Раймонд**, Раймунд — розум + + апека, ахова; апякун (ням.)
**Раймунд**, *гл.* Раймонд
**Райнард** — мудры, моцны (англ.)
**Райнер** — няскораны баец (ням.)
**Райнольд** — розум, рашэнне + панаваць (герм., ням.)
**Раланд** — слава + край, зямля (герм., ням.)
**Рам** — высокі, узвышаны (яўр.)
**Раман** — чалавек з Рыма, рымскі (лац.); моцны (грэч.)
**Рамарык** — выбітны чалавек, слынны ўладальнік, знакаміты валадар (ням.)
**Рамахій** — той, хто ваюе з усімі (грэч.)
**Рамедзій** — той, хто лечыць (лац.); слаўны (герм.)
**Раміл** — моцны (грэч.)
**Рамуальд** — слава, хвала + валадарыць, кіраваць (герм., ням.)

**Рамул**, Ромул — імя легендарнага заснавальніка Рыма (іт.)

**Раслаў**, *гл.* Расціслаў

**Расціслаў**, Раслаў, Раціслаў — які памнажае славу, расце са славай (слав.)

**Ратмір** — адбаронца міру (ст.-слав.)

**Рафаіл** *арх.*, Рафал — лекар Божы, вылячэнне Божае (яўр.)

**Рафал**, *гл.* Рафаіл

**Раціслаў**, *гл.* Расціслаў

**Роберт** — акружаны славай, яркі ад славы (герм.)

**Рогер** — слаўны дзякуючы валоданню кап'ём (герм.)

**Родзінг** — слаўны (герм.)

**Ромул**, *гл.* Рамул

**Рох**, *гл.* Рохальд

**Рохальд**, Рох — баявы вокрык (герм.)

**Рувім** — сын (яўр.)

**Рудольф**, Людольф — слава + + воўк (ст.-герм.)

**Румальд** — той, хто здабыў славу дзякуючы свайму панаванню (герм.)

**Руперт** — якіззяе славай (сакс.)

**Рурык** — слаўны кароль (ст.-сканд.)

**Руслан**, Рустам — волат, гігант (перс.); ад імя *Еруслан* (араб.), якое прыйшло ў рускую і беларускую мовы ад часоў татара-мангольскіх заваёўнікаў

**Рустам**, *гл.* Руслан

**Русцік** — вясковы (лац.)

**Рутылій**, *гл.* Руфімій

**Руф** *ап.* — рыжы (лац.)

**Руфіл**, *гл.* Руфімій

**Руфілій**, *гл.* Руфімій

**Руфім**, *гл.* Руфімій

**Руфімій**, Руфім, Руфін, Руфілій, Руфіл, Рутылій — залацістажоўты, рыжавалосы (лац.)

**Руфін**, *гл.* Руфімій

**Руфіян** — які належыць Руфіну (лац.)

**Рыгор**, *гл.* Грыгорый

**Рыкс** — цар (лац.)

**Рыма** — кінуты (грэч., лац.)

**Рымберт** — бліскучая рада (герм.)

**Рыней** — рэдк.

**Рыхард**, *гл.* Рычард

**Рычард**, Рыхард — уладар, князь, кароль адважны (ст.-герм.)

**Рэас** — рэдк. (гоцк.)

**Рэвакат** — адкліканы (лац.)

**Рэгінальд** — той, хто пануе па волі лёсу (герм.)

**Рэйнгольд** — розум, рашэнне + панаваць, уладарыць (ст.- герм.)

**Рэм** — вясло (лац.); імя брата легендарнага Ромула — заснавальніка Рыма

**Рэмігій** — чалавек, які вырабляе вёслы (лац.)

**Рэнальд** — уладарны дарадчык (герм.)

**Рэнат** — які вярнуўся да жыцця (лац.)

**Рэўдзіт** — імя ўтворана ад спалучэння слоў *революции дитя* (рус.)

**Рэўмір** — імя ўтворана ад спалучэння слоў *революция мировая* (рус.)

**Рэўпуць** — імя ўтворана ад спалучэння слоў *революционный путь* (рус.)

# С

**Саба** — ранішняя зорка (араб.)

**Сабін**, Савін — сабінец (народ у Італіі) (лац.)

**Сабініян** — які належыць Сабіну (лац.)

**Сабяслаў** — сабе + слава (слав.)

**Сава** — віно (яўр.); суботні (грэч.); стары дзед (арам.)

**Савасцей** — свяшчэнны (грэч.)

**Савацей**, *гл.* Савацій

**Савацій**, Савацей — суботні (яўр.)

**Савел**, *гл.* Савелій

**Савелій**, Савел — цяжкая праца (яўр.), цяжкай працай выпрашаны ў Бога (ст.-яўр.)

**Савер**, *гл.* Саверый

**Саверый**, Савер — імя па назве мясцовасці ў Іспаніі (лац.)

**Савін**, *гл.* Сабін

**Савініян** — які належыць Савіну (лац.)

**Садок**, Садонік, Садофій — царскі сябар (перс.); справядлівы, праведны (ст.-яўр.)

**Садонік**, *гл.* Садок

**Садофій**, *гл.* Садок

**Сазон**, *гл.* Сазонцій

**Сазонт**, *гл.* Сазонцій

**Сазонцій**, Сазонт, Сазон — які ратуе, выратавальнік (грэч.)

**Сакердон**, Сакута — святар (лац.)

**Сакрат**, *гл.* Сакрацій

**Сакрацій**, Сакрат — захавальнік улады (грэч.)

**Сакура** — вішня, якая цвіце (япон.)

**Сакута**, *гл.* Сакердон

**Саламан** — мірны (яўр.)

**Саламон** — спакой, шчасце; які жыве (яўр.)

**Салахон** — забойца камянямі (яўр.)

**Салівон**, *гл.* Сілуян

**Сальватор** — выратавальнік, збаўца (лац.)

**Сальвій** — з роду Сальвуса (лац.)

**Самей** *прар.*, Самойла — пачуты Богам (яўр.)

**Самойла**, *гл.* Самей

**Самон** — моцны, дужы, тоўсты (яўр.)

**Самос** — імя ад назвы вострава ў Эгейскім моры, дзе нарадзіўся Піфагор (яўр.)

**Сампсон**, *гл.* Самсон

**Самсон**, Сампсон — сонечны, моцны, дужы (яўр.)

**Самуіл** *прар.*, Самуэль — якога пачуў Бог (яўр.)

**Самуэль**, *гл.* Самуіл

**Сандалій** — сапраўдны воўк (лац.)

**Санірыл** — рэдк.

**Санкцін** — строгі (лац.)

**Сапрон**, *гл.* Сафроній

**Сарафін**, *гл.* Серафім

**Сарбелій** — той, хто носіць шырокія штаны (грэч.)

**Сарвіл** — кіпарыс (араб.); шаравары (перс.)

**Сармат** — ад назвы скіфскага племені (грэч.)

**Сасін**, *гл.* Сасоній

**Сасіпатр** *ап.* — выратавальнік бацькі (грэч.)

**Сасія** — здаровы, жывы (грэч.)

**Сасоній**, Сасін — саксонскі (грэч.); сонечны (яўр.); малпавідны (перс.)

**Сасфен** *ап.* — які не страчвае моцы, ахоўвае крэпасць, захоўвае войска (грэч.)

**Сатарній**, Сатарніл, Сатарнін, Саторній — сыты, багаты; ад імя бога пасеваў Сатурна (лац.)

**Сатарніл**, *гл.* Сатарній

**Сатарнін**, *гл.* Сатарній

**Сатарын** — з горада Сатурына (лац.)

**Саторній**, *гл.* Сатарній

**Сатур**, *гл.* Сатурнін

**Сатурнін**, Сатурыян, Сатур — які належыць Сатурну, Сатурнаў (лац.)

**Сатурыян**, *гл.* Сатурнін

**Сафон**, *гл.* Сафонія

**Сафоній**, *гл.* Сафонія

**Сафонія** *прар.*, Сафоній, Сафон — Гасподзь ахоўвае (яўр.)

**Сафрон**, *гл.* Сафроній

**Сафроній**, Сафрон, Сапрон, Супрын — з цвярозым розумам (грэч.)

**Сацір** — імя ляснога бажаства Саціра; пажадлівы (грэч.)

**Свентазар** — святы + слава (слав.)

**Свентамір** — святы + спакой (слав.)

**Свентаслаў** — святы + слава (слав.)

**Свірыд**, *гл.* Спірыдоній

**Святаполк** — святы + полк, грамада (слав.)

**Святаслаў** — слаўны святасцю (слав.)

**Святлан** — светлы (рус.)

**Себасцьян**, *гл.* Севасціян

**Севасціян**, Севасцьян, Себасцьян — варты пашаны, знакаміты (грэч.)

**Севасцьян**, *гл.* Севасціян

**Север** — паважаны, аскетычны, сур'ёзны (лац.)

**Северыян**, Севяр'ян — Севярынаў; строгі (лац.)

**Севярын**, Сявір — строгі (лац.)

**Севяр'ян**, *гл.* Северыян

**Секунд** — другі, удалы або шчаслівы (грэч.)

**Селафііл** *арх.* — малітва да Бога (яўр.)

**Селіван** — імя бога лясоў, палёў (лац.)

**Селіверст**, *гл.* Селівёрст

**Селівёрст**, Селіверст — лясны (лац.)

**Селівон**, *гл.* Селіфан

**Селіфан**, Селівон — лес (лац.)

**Семідалін** — магчыма, ад *семідал* — назвы самай чыстай пшанічнай мукі, ахвяраванага хлебнага прынашэння (яўр.)

**Сенатар** — член сената (лац.)

**Сеніс**, Сяніс — стары (лац.)

**Серапіён**, *гл.* Серафіён

**Сераслаў** — пазбаўлены + слава (слав.)

**Серафіён**, Серапіён, Серпіён — сонца (егіп.); прысвечаны егіпецкаму богу жыцця, смерці і вылячэння Серапісу (грэч.)

**Серафім**, Серафін, Сарафін — палымяны, яркі, палаючы (яўр.)

**Серафін**, *гл.* Серафім

**Сервіліян** — імя святога (лац.)

**Сервулей**, Сірвуль — малады нявольнік (лац.)

**Сергій**, Сяргей — высокі, шаноўны (лац.)

**Серпіён**, *гл.* Серафіён

**Сівел** — магчыма, грамадзянскі (лац.)

**Сігіберт** — перамога + ясны (герм.)

**Сігізмунд** — перамога + ахова (ст.-герм.)

**Сігіран** — перамога + тайна (ст.-сканд.)

**Сігіц** — у адно месца зліты (грэч.)

**Сігней** — знак (грэч.)

**Сідар**, *гл.* Ісідар

**Сідоній** — чалавек з Сідона — старажытнейшага і багацейшага горада Фінікіі, вядомага яшчэ да Маісея (лац.)

**Сіёній** — ад назвы гары Сіён, якая знаходзіцца ў Іерусаліме і на якой быў пабудаваны палац цара Саламона (яўр.)

**Сікст** — выгладжаны (грэч.); шосты (лац.)

**Сіла** *ап.* — маўчанне, спакой (яўр., лац.)

**Сілан**, *гл.* Сіланцій

**Сіланцій**, Сілан — лясны, дзікі (лац.)

**Сілуян** *ап.*, Сільван, Сільвін, Салівон — лясны, лес (лац.)

**Сільван**, *гл.* Сілуян

**Сільвер**, *гл.* Сільверый

**Сільверый**, Сільвер — які належыць да лесу (лац.)

**Сільвестр** — які жыве ў лесе (лац.)

**Сільвін**, *гл.* Сілуян

**Сім** — знак, імя, назва, слава (яўр.); імя старэйшага сына Ноя — родапачынальніка многіх народаў

**Сіман** *ап.*, Шыман — паслухмяны (яўр.); пачуты Богам (грэч.)

**Сімах** — саюзнік, таварыш па барацьбе (грэч.)

**Сімей** — вядомы, слаўны, знакаміты (яўр.)

**Сімпліцый**, Сімпліцыян — сціплы, просты, прастадушны (лац.)

**Сімпліцыян**, *гл.* Сімпліцій

**Сімфарыян** — спрыяльны, патрэбны (грэч.)

**Сімяон** *ап.*, Сымон, Сямён — пачуты Богам, якога Бог выслухаў (грэч., яўр.)

**Сіндульф** — доўгая ваенная справа + воўк (герм.)

**Сінезій**, Сінятос — розум, развага (грэч.)

**Сінясей** — які атрымлівае ад Бога дапамогу (грэч.)

**Сінятос**, *гл.* Сінезій

**Сірваций** — выратаваны (лац.)

**Сірвуль**, *гл.* Сервулей

**Сірыцій** — які паходзіць з Сірыі (грэч.)

**Сісіній** — фамільнае імя ў родзе Карнеліяў (грэч., лац.); сляпы (лац.)

**Сісой**, Сысой — белы мармур (яўр.); шосты (ст.-яўр.)

**Сіф** — аснова, становішча, дар ад Бога (яўр.); імя трэцяга сына Адама

**Сіцылій** — імя ад назвы вострава *Сіцылія* (лац.)

**Скарбімір** — засмучваць + спакой (слав.)

**Славамір** — слава + спакой (слав.)

**Смарагд** — імя ад назвы зялёнага мінералу смарагду, ізумруду (грэч.)

**Собаль** — магчыма, ад назвы невялікага звярка з сямейства куніцавых (слав.)
**Сосій** — здаровы (грэч.)
**Сотэр** — выратавальнік (грэч., лац.)
**Спартак** — імя кіраўніка рымскага паўстання рабоў, які родам з Фракіі; ужываецца з савецкага часу (лац.)
**Спірыдон**, *гл.* Спірыдоній
**Спірыдоній**, Спірыдон, Свірыд — сплецены кошык (грэч.); незаконнанароджаны (лац.)
**Спяўсіп** — хуткі конь (грэч.)
**Сталій** — слуп (грэч.)
**Станімір** — які ўсталёўвае спакой (слав.)
**Станіслаў** — стаць слаўным (слав.)
**Стахій** *ап.* — колас (грэч.)
**Стаян** — каб застаўся жывы (балг.); ахоўнае імя
**Стратар** — воін (лац.)
**Стратон**, *гл.* Стратонік
**Стратонік**, Стратон — які ваюе, знаходзіцца на ваеннай службе, воін-пераможца (грэч.)
**Страцілат** — палкаводзец (грэч.)
**Стыліян** — слуп (грэч.)
**Стэфан**, *гл.* Сцяфан
**Суімвел** — рэдк. (слав.)
**Сукцэсій** — наступны за кімсьці (слав.)
**Сулібор** — абяцаць, змагацца (слав.)
**Сулімір** — абяцаць, дакляраваць спакой (слав.)
**Сулірад** — абяцаць, дакляраваць або лепшы, магутны (слав.)
**Суліслаў** — абяцаць, дакляраваць + слава (слав.)
**Сульпіцій** — які належыць да роду Сульпіція (лац.)
**Сульпрыцій** — пенны (лац.)
**Супрын**, *гл.* Сафроній
**Супрыян** — Супрынаў, які належыць Супрыну
**Сухій** — рэдк. (груз.)
**Сцібор** — той, хто паважае змаганне (слав.)
**Сцірыкт** — скарочаная форма імені *Феасцірыкт* (грэч.)
**Сцяпан**, *гл.* Сцяфан
**Сцяфан** *ап.*, Сцяпан, Стэфан — вянец, карона (грэч.)
**Сымон**, *гл.* Сімяон
**Сысой**, *гл.* Сісой
**Сяваст** — свяшчэнны (грэч.)
**Сявір**, *гл.* Севярын
**Сякван** — імя ад назвы ракі Сякваны (лац.)
**Сялеўк**, *гл.* Сялеўкій
**Сялеўкій**, Сялеўк — які хістае (грэч.)
**Сялін**, *гл.* Сяліній
**Сяліній**, Сялін — месяцавы (грэч.)
**Сямён**, *гл.* Сімяон
**Сяніс**, *гл.* Сеніс
**Сярвацій** — ўратаваны, выратаваны (лац.)
**Сяргей**, *гл.* Сергій

# Т

**Табіян** — Бог ласкавы (яўр.)
**Тавяіль** — рэдк.
**Тадэвуш**, *гл.* Фадзей
**Талалій** — рэдк. (груз.)
**Тамар** — пальма фінікавая (яўр.); смакоўніца (груз.)
**Тамаш**, *гл.* Фама
**Таміслаў** — дзякаваць + слава (слав.)
**Тарас**, *гл.* Тарасій
**Тарасій**, Тарас — які хвалюецца, усхваляваны (грэч.)
**Тарах** — клопат, хваляванне (грэч.)
**Тарляк** — ад імені бога перуноў Тора (герм.)
**Тарсіцій** — які паходзіць з горада Тарса, дзе нарадзіўся апостал Павел (яўр.)
**Тарычан** — рэдк. (груз.)
**Таўрыён**, Таўрын — юначы; імя ад назвы ракі Таўр (грэч.); ад назвы скіфскага племені ў Таўрыдзе (лац.)
**Таўрын**, *гл.* Таўрыён
**Таціён** — маўклівы заснавальнік (лац.); імя ад прозвішча легендарнага сабінскага цара Ціта Тацію (грэч.)
**Тварымір** — захоўваць + спакой (слав.)
**Тодар**, *гл.* Фядар
**Томас** — блізня, з двойні (яўр.)
**Торпес** — рэдк.
**Торый** — заваёўнік, які перамагае (англ.)
**Траадзій** — з Троі, траадскі (грэч.)
**Трактар** — ад назвы сельскагаспадарчай машыны
**Транквілін**, Транкілін — спакойны, ціхі, ціхамірны (лац.)
**Транкілін**, *гл.* Транквілін
**Трафім** *ап.* — выхаванец, гадаванец (грэч.)
**Траян** — з тройні, каб доўга жыў (балг.)
**Трывімій** — спакойны; перакрыжаванне трох дарог (лац.)
**Трывун** — які трымаецца, выконвае сваё прызначэнне (слав.)
**Трыстан** — сумны (лац.)
**Трыфан** — шыкоўны (грэч.)
**Трыфіл**, *гл.* Трыфілій
**Трыфілій**, Трыфіл — канюшына, выпешчаны, трохлістовы (грэч.)
**Турвон** — віхура, бура, натоўп (лац.)
**Турыбій** — імя ад родавага прозвішча (лац.)
**Тыберый** — ахрышчаны богу ракі Тыбр (лац.)
**Тыгрый**, Цігрый — тыгровы (грэч., лац.)
**Тыцыян** — рымскае радавое імя (лац.)
**Тэабальд** — моцны, магутны, адважны (герм., ням.)
**Тэаген**, *гл.* Феаген
**Тэадарэт**, *гл.* Феадарыт
**Тэадор**, *гл* Фядар
**Тэадосій**, *гл.* Феадосій
**Тэадул**, *гл.* Феадул
**Тэадульф** — рэдк.
**Тэадэмір** — слаўны народ (герм.)
**Тэапемпт** — пасланы Богам (грэч.)
**Тэафан**, *гл.* Феафан
**Тэафіл**, *гл.* Феафіл
**Тэафрэд** — мірны народ (герм.)
**Тэлясфор** — той, хто давядзе справу да канца (грэч.)
**Тэон**, *гл.* Фяёна
**Тэрцый** *ап.*, Церцій, Цярціл — трэці (грэч.)

# У

**Уалент**, *гл.* Валенцій

**Убальд** — моцны духам, валадар (ням.)

**Увар** — цяжкі, крываногі (грэч.); крывы (лац.)

**Уладзілен**, Уладлен — ад пачатовых складоў імя і прозвішча *Владимир Ленин* (рус.)

**Уладзімір** — які валодае светам, вялікі, знакаміты (слав.)

**Уладзіслаў**, Уладыслаў, Уладзіслаў — які валодае славай (слав.)

**Уладлен**, *гл.* Уладзілен

**Уладыслаў**, *гл.* Уладзіслаў

**Улас**, *гл.* Уласій

**Уласій**, Улас — невук, просты (грэч.)

**Уліт** — ліпень (лац.)

**Уллян**, *гл.* Юліян

**Ульдарык** — той, хто паходзіць з багатага роду (герм.)

**Ульпіян** — прыняты ў род Ульпіяў (лац.)

**Ульрых** — багаты (ням.)

**Ульян**, *гл.* Юліян

**Умфрыд** — рэдк.

**Унгер** — венгр, з Венгрыі (яўр.)

**Урал** — магчыма, ад назвы гор (рус.)

**Урацілаў** — вярнуць славу (слав.)

**Урбан**, *гл.* Урван

**Урван** *ап.*, Урбан — гарадскі, ветлівы (лац.)

**Урзус** — мядзведзь, моцны (лац.)

**Урош** — ахоўнік (грэч.)

**Урпасіян** — горад (лац.)

**Урсын**, Урсыцін — мядзведжы (лац.)

**Урсыцін**, *гл.* Урсын

**Урыіл** *арх.* — святло Божае, свет мой Бог (яўр.)

**Урый** — святло, свяціла (ст.-яўр.); спадарожны вецер (грэч.)

**Усевалад** — які ўсім валодае (слав.)

**Усфазан**, Хусдазат — свабодная, вольная душа (араб.)

**Усцім**, *гл.* Іўсцін

**Усцін**, *гл.* Іўсцін

**Усяслаў** — славуты (слав.)

**Уўрыкій** — рэдк.

# Ф

**Фабіян** — ад назвы рымскага роду Фабіі (лац.)

**Фабрыцій** — рамеснік, каваль ці цясляр (лац.)

**Фавій** — бабовы (лац.)

**Фадзей** *ап.*, Тадэвуш — хвала, пахвала, прывабнасць мая, хараство (яўр.)

**Факунд** — красамоўны (лац.)

**Фал** — маладая маслінавая раслінка; вежа, зробленая для аховы, абароны ад непрыяцеля, ворага (грэч., лац.)

**Фалалей**, Фалялей — квітнеючая масліна (грэч.)

**Фаламей** — сын радасці (яўр.)

**Фаларыд** — рэдк.

**Фаласій** — марскі, спрытны ў марской справе (грэч.)

**Фалялей**, *гл.* Фалалей

**Фама** *ап.*, Тамаш — з двойні, блізня (яўр.)

**Фаміян** — які належыць Фаме (яўр.)

**Фанцей** — рэдк.

**Фанцін** — дзіця (лац.)

**Фарвін** — карміцель (грэч.); які кіпіць (лац.)

**Фармакей**, *гл.* Фармакій

**Фармакій**, Фармакей — імя персідскага правіцеля ў Малой Азіі (перс.)

**Фармофій**, *гл.* Фармуфій

**Фармуфій**, Фармофій — назва па-егіпецку месяца красавіка (егіп.)

**Фарнак**, *гл.* Фарнакій

**Фарнакій**, Фарнак — магчыма, далікатны, ласкавы (яўр.)

**Фартунат** *ап.* — шчаслівы, удачлівы (лац.)

**Фаст** — паспяховы, які заўсёды ўсё вырашае паспяхова (лац.)

**Фасцірый** — свяшчэннік (грэч.)

**Фаўмасій** — дзівосны, выдатны (грэч.)

**Фаўст**, *гл.* Фаўсцін

**Фаўсцін**, Фаўст — шчаслівы (лац.)

**Фаўсціян** — які належыць Фаўсту (лац.)

**Фацей**, *гл.* Фоцій

**Фацін**, *гл.* Фоцій

**Фацьян** — які належыць Фаціну, светлы (грэч., лац.)

**Фаэлан** — малы воўк, ваўчаня (ст.-ірл.)

**Феаген**, Феагнід, Фяогній, Тэаген, Феагній — народжаны багамі (грэч.)

**Феагнід**, *гл.* Феаген

**Феагній**, *гл.* Феаген

**Феагност** — Богу вядомы (грэч.)

**Феадарыт**, Тэадарэт — дараваны Богам (грэч., лац.)

**Феадокс** — рэдк.

